

СВЯТА ДЛЯ КОЖНАГА БЕЛАРУСА

4-5

ТУРНІР ПЕРАМОЖЦАЎ



19

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ВЕРАСНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 174 (29543)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

КОРАТКА

- Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне ўдзельнікам і гасцям XXV тэатральнага фестывалю «Белая вежа».
- Станцыю абезжалезвання ўвялі ў эксплуатацыю ў вёсцы Цяруха Гомельскага раёна.
- ААН: стыхійныя бедствы за 2020—2021 гады звязаныя з дзейнасцю чалавека.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Чакаем далейшага росту грузаперавозак паміж Беларуссю і Расіяй з улікам таго, што з-за вядомых абставін мы пераарыентуем свае таварныя патокі па расійскіх лагістычных калідорах. У сувязі з гэтым вельмі значная роля чыгуначнага транспарту. Рэалізацыя праекта па пераваліцы беларускіх нафтапрадуктаў праз парты РФ — добры прыклад таго, як у кароткія тэрміны ўдалося пры палітычнай падтрымцы падрыхтаваць лагістычную схему і захаваць эканамічную мэтазгоднасць для абодвух бакоў. Задачу па пераарыентацыі такіх аб'ёмаў грузапатокаў удалося вырашыць хутка дзякуючы належнай матывацыі. Мы зацікаўленыя задзейнічаць усю транспартна-лагістычную інфраструктуру Расіі, асабліва з улікам таго, што мы вельмі блізка падышлі да чарговага этапу нашай эканамічнай інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы».*

# СУМЛЕННА, АДКРЫТА, КАНСТРУКТЫЎНА

**Прэзідэнты Беларусі і Расіі ўзгаднілі ўсе 28 саюзных праграм, і сёння, у пятніцу, яны будуць разгледжаны на ўзроўні ўрадаў дзвюх краін у Мінску, пасля чаго будуць вынесены на пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якое плануецца правесці да канца бягучага года. Аб гэтым заявіў журналістам Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін па выніках перагавораў з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам у Маскве.**



Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу назваў перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у Маскве сумленнымі, адкрытымі і канструктыўнымі, перадае карэспандэнт БелТА.

«Перш за ўсё хачу падзякаваць майму калегу, Прэзідэнту Расіі, за той прыём, які быў аказаны нашай дэлегацыі, а таксама за гранічна сумленны, адкрыты і канструктыўны характар сённяшняй сустрэчы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, Беларусь і Расія з'яўляюцца паўнапраўнымі партнёрамі.

Цэнтральнай тэмай перагавораў двух лідараў стала завяршэнне работы над саюзнымі праграмамі. Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, ***на перагаворах былі прыняты ўсе прынцыповыя рашэнні.***

Гаворачы аб выніках перагавораў, кіраўнік дзяржавы перш за ўсё выказаўся пра вынікі работы над саюзнымі праграмамі — па яго словах, «самай аб'ёмнай і, напэўна, самай раскручанай тэме сённяшняй гутаркі». Прэзідэнт нагадаў, што прадметная праца над так званымі дарожнымі картамі пачалася тры гады таму. Да іх распрацоўкі вырашылі прыступіць пасля крытыкі Саюзнай дзяржавы, якая прагучала ў грамадстве: маўляў, яна страціла тэмп развіцця.

Тады гэтыя дакументы, па сутнасці, уяўлялі сабой «нейкія інтэграцыйныя контуры па асобных напрамках». Кожная ж з сённяшніх праграм — гэта ўжо пэўны план мерапрыемстваў, згодна з якім краіны і маюць намер рухацца далей.

«Урады прарабілі каласальную працу. Мы з Уладзімірам Уладзіміравічам усе прынцыповыя рашэнні, якія датычыліся нас, сёння прынялі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Каб не пераказваць змест разгледжаных дакументаў, вылучу самае галоўнае з іх. Гэта роўныя правы для суб'ектаў гаспадарання нашых краін. Тыя самыя роўныя ўмовы, пра неабходнасць якіх розныя прадстаўнікі Беларусі, у тым ліку я як Прэзідэнт, гаворым на працягу многіх гадоў. Гэта аснова асноў. Мы — паўнапраўныя партнёры», — канстатаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

На кантролі

# Зацягнуўся рамонт...

**У Гродне капітальным рамонтам сёлета плануецца ахапіць каля 140 дамоў. На адных аб'ектах ён толькі пачаўся, на іншых — у стадыі актыўных работ, на некаторых ужо завершаны. Ёсць і такія, дзе работы вядуцца звыш нарматыўных тэрмінаў, што выклікае скаргі з боку жыхароў. У Камітэце дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці паведамілі адрасы некаторых праблемных дамоў абласнога цэнтра, дзе капітальны рамонт значна зацягнуўся.**




СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X

21174
9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2021 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# СУМЛЕННА, АДКРЫТА, КАНСТРУКТЫЎНА




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік Беларусі спытаў крытыкаў Саюзнай дзяржавы ў Беларусі: што ў прынятых рашэннях дрэннага для беларусаў? «А ў крытыкаў нашай інтэграцыі ў Расіі хачу пацікавіцца: дзе вы бачыце тут « гіру на назе Расійскай Федэрацыі»? Нічога дрэннага для народаў Беларусі і Расіі ў гэтых праграмах няма і быць не магло. Усё было нацэлена на рост дабрабыту нашых народаў. І трэба, напэўна, ужо паставіць кропку ў гэтых размовах. Наша інтэграцыя носіць выключна ўзаемавыгадны характар», — заявіў беларускі лідар.

***«Зразумела, што не ўсе вузлы ў нашых адносінах яшчэ развязаныя.*** Пры такім аб'ёме ўзаемадзеяння гэта нармальна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым ён звярнуў увагу, што платформа для далейшага руху створана. «Дзякуючы ёй мы будзем і далей забяспечваць сацыяльныя гарантыі, паступальна павышаць дабрабыт беларусаў і расіян», — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што для ўсіх кампаній на рынках Беларусі і Расіі павінна быць сумленная канкурэнцыя. «Менавіта дзеля раўнапраўя, выгаднай кааперацыі, плённага супрацоўніцтва і ладзілася беларуска-расійская інтэграцыя, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — ***У саюзных праграмах дакладна прапісаны механізмы развіцця адзінай эканамічнай прасторы:*** фарміраванне аб'яднаных галіновых рынкаў, рэалізацыя гарманізаванай фінансавай, падатковай, крэдытнай, цэнавай, гандлёвай палітыкі».

У гэтых праграмах, паводле слоў Прэзідэнта, ***таксама закладзена вырашэнне праблемы паставак у Беларусь энерганосьбітаў,*** рост аб'ёму транспартных паслуг, фінансаванне новых інвестыцыйных праектаў, выхад на адзіныя прынцыпы рэалізацыі аграрнай і прамысловай палітыкі, павышэнне ўзроўню ўзаемных сацыяльных гарантый для грамадзян дзвюх краін. «Я абсалютна перакананы, што паглыбленне інтэграцыі, нарошчванне разнапланавага ўзаемадзеяння — самы паказальны, дзейсны адказ усім нашым нядобразычліўцам. Разам мы толькі мацней», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што шмат каму можа падаца, што рэалізацыя распрацаваных Беларуссю і Расіяй саюзных праграм занадта расцягнутая па часе. Па словах кіраўніка дзяржавы, інакш быць і не можа. Да гэтых пытанняў неабходна падыходзіць выверана.

***«Мы, як бульдозер, ідзём наперадзе, расчышчаючы дарогу для аб'яднанняў на постсавецкай прасторы»,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Пуцін расказаў пра некаторыя падрабязнасці 28 саюзных праграм, якія адобраны ўчора на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. У тым ліку аб планах па фарміраванні ў перспектыве адзінай грашова-крэдытнай палітыкі, валютнага рэгулявання, інтэграцыі нацыянальных плацежных сістэм і стварэння агульнай плацежнай прасторы. «Гэта дапаможа забяспечыць добрасумленную канкурэнцыю і нарасціць дзелавую актыўнасць на фінансавым рынку, а таксама эфектыўна рэагаваць на рызыкі адмывання грошай і фінансавання злачыннай дзейнасці, уключаючы тэрарызм», — сказаў Прэзідэнт Расіі. Паводле яго слоў, Беларусь і Расія дамовіліся аб правядзенні агульнай макраэканамічнай палітыкі. «Нашы эксперты лічылі, што без вырашэння гэтых пытанняў нельга пераходзіць да іншых па асобных таварных групах», — растлумачыў кіраўнік расійскай дзяржавы.

Таксама Уладзімір Пуцін паведаміў, ***што Беларусь і Расія здымуць усе кавідныя абмежаванні ў пасажырскіх авіязносінах.*** А аб'ём крэдытнай падтрымкі Беларусі з боку Расіі складзе больш за $ 600 млн з верасня гэтага года да канца 2022 года.

Закранаючы «грашовую» тэму, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ***Беларусі і Расіі пакуль рана пераходзіць да адзінай валюты.*** «Пытанне не ў тым, што Пуцін ці Лукашэнка тармозяць гэтыя працэсы. Калі мы вывучалі гэтую праблему, тады Цэнтральны банк Расіі і наш Нацыянальны банк папрасілі да гэтага пытання пакуль не падыходзіць. Яны заявілі, што нашы краіны не гатовыя да гэтага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, гэта пытанне пакуль адкладзена ў бок. «Але гэта не азначае, што мы да яго не вернемся», — адзначыў беларускі кіраўнік.

Што краіны пакуль не гатовыя пераходзіць да адзінай валюты, лічыць і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Ён паведаміў, што абмеркаваў з беларускім калегам Аляксандрам Лукашэнкам фарміраванне адзінай абароннай прасторы дзвюх краін і забеспячэнне бяспекі.

«Сёння намі абмеркаваны пытанні будаўніцтва адзінай абароннай прасторы і забеспячэнне бяспекі Саюзнай дзяржавы на знешніх перыметры», — сказаў у чацвер кіраўнік расійскай дзяржавы. Паводле яго слоў, «у гэтым кантэксце вялікае значэнне маюць сумесныя вучэнні на тэрыторыі Расіі і Беларусі «Захад-2021». Пуцін таксама запэўніў, што гэтыя вучэнні не накіраваныя супраць каго-небудзь. Ён растлумачыў, што правядзенне сумесных вучэнняў «лагічна ва ўмовах, калі іншыя аб'яднанні, НАТА, напрыклад, актыўна нарошчваюць сваю прысутнасць паблізу межаў Саюзнай дзяржавы і прасторы АДКБ».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ***Беларусь выконвае ўсе свае абавязацельствы з партнёрамі, але ва ўмовах санкцый не можа забяспечваць бяспеку Еўрапейскага саюза на мяжы.*** «Вы супраць нас кожны дзень уводзіце санкцыі. Мы ўжо на санкцыях на парадак апярэдзілі Расійскую Федэрацыю. І я, і беларускі народ, што — павінен абараняць вас на мяжы?» — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнікі дзяржаў падчас перамоваў, акрамя паглыблення інтэграцыі паміж краінамі, дэталёва абмеркавалі і актуальныя міжнародныя праблемы, адносіны з суседнімі краінамі і аб'яднаннямі. Падрабязна прэзідэнты спыніліся на абстаноўцы ў зонах нестабільнасці, перш за ўсё ў Афганістане, з пункту гледжання пагроз для бяспекі Саюзнай дзяржавы.

«У гэтым кантэксце першачарговая важнасць — забеспячэнне ўсебаковай бяспекі нашых краін і АДКБ у цэлым. Адзіную пазіцыю па гэтым пытанні мы ўсе разам зацвердзім у ходзе маючых адбыцца мерапрыемстваў у Душанбэ (самітаў АДКБ і ШАС. — **Заўв. рэд.**). Нават мы, знаходзячыся ў цэнтры Еўропы — далёка ад тэатра ваенных дзеянняў, адчулі на сабе наступствы афганскага крызісу. Паглядзіце, што робіцца з бежанцамі на нашых межах, як паводзіць сябе «прагрэсіўны» Захад. Больш за тое, пастаянна ўжо бразгаючы зброяй», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У гэтым кантэксце лідары закранулі тэму саюзных ваенных вучэнняў «Захад-2021». «Сумеснае супрацьдзеянне агульным выклікам і пагрозам будзем толькі нарошчваць, — заявіў Прэзідэнт. — І тут не трэба крычаць, што мы праводзім гэтыя вучэнні. У нас ёсць армія, сумесная групоўка на заходнім напрамку. Яе трэба навучаць ваеннаму рамяству, мы нічога выключнага не робім».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што кіраўніцтва абедзвюх краін будзе прадпрымаць крокі выключна ў інтарэсах народаў. Калі Беларусі і Расіі спатрэбіцца больш цесныя адносіны, гэта будзе зроблена імгненна, як толькі прагучаць запыты грамадзян, заявіў Прэзідэнт.

Блізкая ўлада

# ТРАНСПАРТ, ЖЫЛЛЁ І ШКОЛЬНАЕ ПЫТАННЕ

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ правёў прыём грамадзян у Пастаўскім райвыканкаме.**

Першай на прыём звярнулася жыхарка вёсцы Вярэнькі: скарацілі колькасць рэйсаў пасажырскага аўтобуса Паставы — Гуменнікі. Дзецям па часе няпрручна дабірацца са школы дадому. Асабліваць у тым, што школьнікі з Пастаўскага раёна ездзяць ва ўстанову адукацыі ў Мядзельскі раён, але гэта іншы рэгіён. Максім Рыжанкоў адзначыў, што разбярэцца з пытаннем у Мінску, пагутарыць з мясцовай уладай і транспартнай арганізацыяй.

Пенсіянеры з Маладзечна звярнуліся з праблемай немагчымасці пражывання ў прыватным доме з-за будаўніцтва побач шматпавярховіка. Райвыканкам і гаспадары дома не могуць знайсці кампраміснае рашэнне: пабудаваць новы дом, выдаць уладальніку дзве кватэры, роўныя па метражы прыватнаму дому, або кампенсаваць суму, роўную кошту жылля. Мясцовай уладзе даручана за месяц абмеркаваць пытанне з уладальнікам і знайсці рашэнне. Калі праблема застанецца, то Максім Рыжанкоў мае намер сам прыехаць да заяўнікаў і паглядзець усё на месцы.

З калектыўным зваротам прыйшлі бацькі школьнікаў. Іх дзеці раней вучыліся ў базавай школе № 5 Паставаў, яе нядаўна закрылі, хоць навучальную ўстанову нядаўна адрамантавалі. Па іх словах, ім не патлумачылі прычыны закрыцця ўстановы адукацыі і своечасова пра гэта не апавясцілі — бацькі даведаліся пасля рашэння райвыканкама. Яны незадаволеныя такім стаўленнем, а цяпер яшчэ дзецям нязручна дабірацца да школы, першакласнікам трэба ехаць з некалькімі перасадкамі. «Столькі зваротаў, звязаных з закрыццём школ, як з Віцебскай вобласці, не паступае да нас ні з аднаго іншага рэгіёна краіны», — адзначыў Максім Рыжанкоў. Пасля прыёму грамадзян ён вырашыў з'ездзіць у былую школу, каб лепш вывучыць сітуацыю.

Падчас прыёму людзі таксама звярнуліся па пенсіённай тэме, жыллёвым пытанні і пытаннях медыцынскага абслугоўвання. Размаўляючы з журналістамі, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што ён хацеў прыехаць у Пастаўскі раён, каб паглядзець, як тут рэалізуюць прынятыя рашэнні па развіцці інфраструктуры, вытворчасці ў райцэнтрах. «Прыемна ўразілі новыя вытворчасці — аграаб'яднанне на базе малочнага завода. Прыгожае і сучаснае прадпрыемства, прадукцыя якога карыстаецца попытам не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Таксама добрае прадпрыемства дрэваапрацоўкі, прадукцыя якога ідзе на Захад. Пры наяўнасці такога роду вытворчасцяў, дасведчаных кіраўнікоў можна казаць пра далейшае развіццё рэгіёна», — сказаў Максім Рыжанкоў.

Ён падкрэсліў, што калі моладзь будзе заставацца ў родных мясцінах, то гаворка аб развіцці школьнай інфраструктуры таксама будзе ісці. У выпадку зваротных працэсаў прыйдзецца прымаць непапулярныя рашэнні па аптымізацыі ўстаноў адукацыі. «На жаль, не ўсе нашы чыноўнікі на месцах навучыліся прадукцыйна размаўляць з людзьмі, прымаючы тыя ці іншыя рашэнні. Так, напэўна, неабходная аптымізацыя школ з улікам дэмаграфічнай сітуацыі ў невялікіх населеных пунктах, райцэнтрах. Але з людзьмі трэба размаўляць, паказваць перавагі пераезду дзяцей з малакамплектнай школы, дзе, можа, і няма настаўнікаў па многіх прадметах. Калі ідзе аптымізацыя з горшага ў лепшае, ствараюцца камфортныя ўмовы, змяняецца графік руху транспарту, і людзям пра гэта кажуць, то нідзе не ўзнікае пытанняў. А калі мясцовая ўлада прыняла рашэнне, школу закрыла, і думайце, што хочаце, пры гэтым не заўсёды пайшлі насустрач па вырашэнні спадарожных пытанняў для навучання ў новым месцы, то ўзнікаюць праблемы. Тады няма ніякай нагоды наракаць на бацькоў за празмерныя звароты ў розныя інстанцыі, таму што іх многія пытанні не пачулі» , — дадаў Максім Рыжанкоў.

**Паводле БелТА.**

# «Непахіснасць афіцыйных падыходаў»

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ сустрэўся з апостальскім нунцыем у Беларусі, архібіскупам Антэ Ёзічам. У час сустрэчы абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага парадку дня, паведамілі ў прэс-службе знешнепалітычнага ведамства.**

Бакі абмеркавалі гуманітарнае супрацоўніцтва, а таксама ўзаемадзеянне дзвюх дзяржаў у міжнародных арганізацыях. Уладзімір Макей пацвердзіў традыцыйную нацэленасць на далейшае развіццё канструктыўнага супрацоўніцтва з Ватыканам, расказалі ў міністэрстве.

«Падкрэслена непахіснасць афіцыйных падыходаў у адносінах да Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі, недапушчальнасць распальвання рэлігійнай нецярпімасці і важнасць захавання ў краіне этнаканфесійнай згоды ў цэлым. У гэтым кантэксце не трэба надаваць ніякага значэння асобным, выключна суб'ектыўным, спробам намаляваць сітуацыю інакш», — адзначылі ў прэс-службе.

Суразмоўнікі дамовіліся і далей падтрымліваць адкрыты і транспарэнтны дыялог па ўсіх пытаннях, звязаных з актывізацыяй беларуска-ватыканскага ўзаемадзеяння і ўмацавання міжканфесійнай згоды.

Армія

# На старце — іспыт двухгоддзя

## Сёння пачалося сумеснае стратэгічнае вучэнне Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2021»

**Працягнуцца беларуска-расійскія манеўры да 16 верасня. Вучэнне носіць выключна абарончы характар і, у першую чаргу, накіравана на ўдасканаленне баявога майстэрства ваеннаслужачых, а таксама адпрацоўку сумесных дзеянняў на выпадак, калі Саюзная дзяржава будзе вымушана рэагаваць на ваенную агрэсію з боку іншых дзяржаў.**


Фота БелТА.

Задачы, пастаўленыя ў ходзе вучэння, будуць ажыццёўлены як на чатырох беларускіх, так і на дзевяці расійскіх палігонах. У манеўрах, якія адбудуцца на нашай тэрыторыі, возьме ўдзел каля 12 800 ваеннаслужачых: сярод іх 2,5 тысячы расійскіх і 50 вайскоўцаў з Казахстана са складу Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Акрамя таго, у вучэнні будзе задзейнічана каля 350 адзінак бранятанкавай тэхнікі, да 110 адзінак артылерыі і рэактыўных сістэм залпавага агню, звыш 30 самалётаў і верталётаў.

— Колькасць войскаў, танкаў, баявых браніраваных машын, ракетных сістэм залпавага агню і артылерыйскіх сістэм, запланаваных вылетаў самалётаў не перавышае ўзровень, які падлягае абавязковамуназіранню за пэўнымі відамі ваеннай дзейнасці, што ўстаноўлена шматлікімі дагаворамі і пагадненнямі ў галіне кантролю над узбраеннем, — удакладніў падчас брыфінгу **начальнік дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнік міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва генерал-маёр Алег ВОІНАЎ.** — Ваенна-палітычная абстаноўка ў свеце ў цэлым і ў еўрапейскім рэгіёне ў прыватнасці пагражае актуалізацыяй тых ваенных пагроз, якія існуюць, а таксама ўзнікненнем новых. На гэтым неспрыяльным фоне Беларусь імкнецца да паніжэння канфліктнага патэнцыялу ва Усходняй Еўропе, праводзячы міралюбівую і адкрытую палітыку.

Як адзначыў памочнік кіраўніка абароннага ведамства, знешнепалітычны курс разам з адсутнасцю тэрытарыяльных прэтэнзій да суседзяў, знаходжанне ў саюзе з Расіяй і членства ў АДКБ абумовілі выбар менавіта абарончай тэматыкі вучэння як пацвярджэнне строгай прыхільнасці Беларусі да ўмацавання рэгіянальнай бяспекі. На практыцы гэтая пазіцыя адлюстроўваецца ў адсутнасці на тэрыторыі нашай краіны замежных ваенных баз з узбраеннем і ваеннай тэхнікай.

Як заўважыў Алег Воінаў, нашы заходнія партнёры пастаянна нарошчваюць ваенную прысутнасць на граніцах Саюзнай дзяржавы. «Колькасць сіл першачарговага задзейнічання НАТА павялічана да 40 тысяч чалавек, — акцэнтаваў увагу военачальнік. — Створаны перадавыя камандныя цэнтры альянсу, шматнацыянальныя батальённыя і тактычныя групы блока, прыведзеныя ў поўную аператыўную гатоўнасць. У Польшчы і краінах Балтыі дыслацыруецца замежны воінскі кантынгент колькасцю больш чым 8,5 тысячы ваеннаслужачых, а таксама каля 120 танкаў, звыш 230 баявых браніраваных машын, каля 70 артылерыйскіх сістэм і ракетных сістэм залпавага агню, а таксама больш чым 30 баявых самалётаў і верталётаў. Адначасова назіраецца пастаяннае нарошчванне колькасці і баявога патэнцыялу ўзброеных сіл сумежных дзяржаў — членаў НАТА ў непасрэднай блізкасці ад Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, па словах Алега Воінава, з высокай інтэнсіўнасцю праводзяцца вучэнні, у ходзе якіх у тым ліку адпрацоўваюцца пытанні перакідвання войскаў: падрыхтоўка маршрутаў руху да раёнаў прызначэння, стварэнне груповак, навядзенне пераправ, фарсіраванне водных перашкод, высадка дэсанта і шматлікія іншыя задачы, характэрныя менавіта для вядзення наступальных дзеянняў. «У цэлым, колькасць вучэнняў у рэгіёне за апошнія сем гадоў павялічылася больш чым у тры разы, — заявіў начальнік дэпартамента. — Нават на фоне пандэміі інтэнсіўнасць мерапрыемстваў падрыхтоўкі ўзброеных сіл краін НАТА і дзяржаў-партнёраў, якія праводзяцца на тэрыторыі краін-суседзяў, а таксама колькасць прыцягнутых войскаў і шматлікіх сістэм узбраення заставаліся на дастаткова высокім узроўні. Вядома, кожная суверэнная дзяржава або іх блок мае права праводзіць мерапрыемствы аператыўнай і баявой падрыхтоўкі войскаў, накіраванасць якіх залежыць ад ацэнкі кіраўніцтвам той ці іншай краіны ваенна-палітычнай абстаноўкі ў рэгіёне і свеце. Аднак іх характар і інтэнсіўнасць, якая прагрэсіруе, не можа не выклікаць у нас занепакоенасці, асабліва пасля шэрага правакацыйных дзеянняў з боку нашых заходніх суседзяў».

У прыватнасці, вучэнне НАТА «Абаронца Еўропы — 2021» было адным з найбуйнейшых у Еўропе за апошнія тры дзесяцігоддзі. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі 24 дзяржаў. Усе асноўныя параметры гэтага вучэння альянсу ў некалькі разоў перавышаюць паказчыкі вучэння «Захад-2021». Па колькасці вайскоўцаў — у 3 разы, узбраення і ваеннай тэхнікі — амаль у 4,5 раза, самалётаў і верталётаў — у 3,5 раза.

Як падкрэсліў Алег Воінаў, праведзенне сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2021» не нясе ніякай пагрозы ні для еўрапейскай супольнасці ў цэлым, ні для суседніх краін у прыватнасці. «Вучэнне дазволіць на практыцы ўдасканаліць механізм сумеснага выкарыстання абароннай інфраструктуры ў інтарэсах забеспячэння ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы і стварэння ўмоў для больш эфектыўнага забеспячэння нацыянальнай бяспекі, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. — Наша краіна даражыць рэпутацыяй адказнага партнёра і няўхільна выконвае ўсе ўзятыя на сябе абавязацельствы ў межах міжнародных і рэгіянальных дамоў па раззбраенні, верыфікацыйнай дзейнасці і ўмацаванні мер даверу і бяспекі ў рамках ААН і АБСЕ».

**Вераніка КАНЮТА.**

На варце жыццяў

# Шчыт бяспекі ўзмоцнены

**Адразу 25 адзінак сучаснай пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі і тры легкавыя аўтамабілі з'явіліся ў падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях Мінскай вобласці. Ва ўрачыстай абстаноўцы іх уручылі ў мемарыяльным комплексе «Курган Славы».**

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч, міністр па надзвычайных сітуацыях Беларусі, генерал-маёр унутранай службы Вадзім Сіняўскі, а таксама старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын ушанавалі памяць воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, усклаўшы кветкі да Кургана Славы. Кіраўнік Мінскай вобласці ўручыў узнагароды ратавальнікам Мінскай вобласці, а таксама цывільным, хто аказаўся неабыякавым да жыцця іншых.

**Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі генерал-лейтэнант Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** падчас сустрэчы адзначыў, што абарона жыцця і здароўя грамадзян нашай краіны — адна з найважнейшых задач, якая стаіць перад дзяржавай. І сістэма, створаная ў краіне па ліквідацыі і папярэджанні надзвычайных сітуацый, функцыянуе ўстойліва. «Кіраўніцтва Мінскай вобласці набыло 25 аўтацыстэрнаў і легкавыя аўтамабілі, усё гэта — найноўшыя ўзоры беларускай вытворчасці. Усё да вінціка, да шрубкі — наша, айчыннае. Гэтага і патрабуе кіраўнік дзяржавы. Тэхніка адпавядае ўсім сусветным стандартам: яе набываюць далёка за межамі краіны, і яна карыстаецца добрым попытам. Гэта сведчыць аб якасці беларускай прадукцыі».



— Калі здараюцца непрыемныя сітуацыі, на месцы неадкладна з'яўляюцца ратавальнікі: іх доўг — аказаць дапамогу, папярэдзіць развіццё надзвычайнай сітуацыі і аператыўна ліквідаваць яе наступствы. І выкарыстанне новай тэхнікі спецыялістамі — абавязковая ўмова для таго, каб яны працавалі ў камфортных умовах і якасна выконвалі свае абавязкі, — упэўнены **Аляксандр ТУРЧЫН.**

— У арсенале Мінскага абласнога ўпраўлення МНС — «ЗІЛ-131» — савецкая надзейная тэхніка. Але нават яна выходзіць са строю. Да таго ж мы бачым эксплуатацыйныя выдаткі, расход паліва, тым больш аб'ём цыстэрны ў новых машынах у два разы больш. Гэта ўсё эканамічныя складнікі. Яны пралічваюцца, і мы бачым, які эфект атрымаем ад набыцця новай тэхнікі. Акрамя таго, гэта работа нашых прадпрыемстваў. Уся спецтэхніка выраблена на шасі айчынных аўтамабіляў «МАЗ», яны, як і тры легкавыя аўтамабілі Geely Atlas, набыты за сродкі Мінаблвыканкама. І, самае галоўнае, гэта бяспечныя і камфортныя ўмовы працы асабовага складу аддзяленняў па надзвычайных сітуацыях, а таксама эфектыўная работа па ліквідацыі надзвычайных сітуацый. З новай тэхнікай наш агульны шчыт бяспекі стане яшчэ больш трывалы. І вага ў барацьбе з вогненнай стыхіяй або іншай надзвычайнай сітуацыяй яшчэ больш схіліцца ў наш бок, — дадаў старшыня Мінскага аблвыканкама.

Спецыяльныя званні і ўзнагароды работнікам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях уручыў **Вадзім СІНЯЎСКІ.** Ён дадаў, што такое мерапрыемства напярэдадні Дня народнага адзінства невыпадковае. «Тыя, хто зрабілі гэтую новую тэхніку, зрабілі сродкі для падраздзяленняў МНС, сёння стаяць побач з аўтацыстэрнамі і аўтамабілямі, якія ўжо заўтра заступяць на баявое дзяжурства і будуць выконваць задачы па ратаванні людзей разам з асабовым складам. Гэта і ёсць народнае адзінства».

Напрыканцы ўрачыстага мерапрыемства настаяцель прыхода храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы іерэй Іаан Ясюкевіч правёў малебен і асвяціў новую спецтэхніку.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота МНС.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Стала вядома аб падрыхтоўцы новага саміту Пуціна і Байдэна

**Расія і ЗША вядуць перагаворы з нагоды падрыхтоўкі новага саміту расійскага прэзідэнта Уладзіміра Пуціна і амерыканскага лідара Джо Байдэна.**

Ёсць магчымасць, што сустрэча абодвух лідараў адбудзецца ў кастрычніку. Паведамляецца, што меркаванае кола пытанняў будзе традыцыйнае. Намячаецца абмеркаванне стратэгічнай стабільнасці, кантролю над узбраеннямі, кібербяспекі, Украіны, Афганістана, Цэнтральнай Азіі і Блізкага Усходу.

### Венгрыя раскрытыкавала ЕС за ціск на Польшчу

**Венгрыя выказвае салідарнасць з Польшчай у святле санкцый супраць польскага ўрада, да якіх заклікала Еўракамісія з-за судовай рэформы Варшавы. Рашэнне Брусеня раскрытыкавала венгерскі міністр юстыцыі Юдыт Варга.**



«Гэтым скандальным і нахабным крокам Камісія перайшла рысу, перасячэння якой мы ад яе зусім не чакалі», — сказала Варга.

Яна абвінаваціла ЕС у «імперыялізме» і расказала, што Венгрыя склікае сустрэчу Вышаградскай чацвёркі і разам з Польшчай, Славакіяй і Чэхіяй збіраецца «асудзіць недастойныя атакі Брусеня».

Раней стала вядома, што Еўракамісія запатрабавала ўвесці санкцыі супраць Польшчы з-за судовых рэформаў: у выканаўчым органе ЕС прыйшлі да высновы, што польская дзяржава падрывае незалежнасць судовай сістэмы.

### Брытанцаў прымусяць плаціць самыя высокія падаткі за ўсю гісторыю краіны

**Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан атрымаў мандат ад Палаты абшчын на павышэнне падаткаў да самага высокага ўзроўню за ўсю гісторыю краіны для фінансавання аховы здароўя, паведамляе Bloomberg.**

Падатак на фонд заработнай платы з наступнага года вырасце на 1,25 працэнта, а таксама дадатковыя 1,25 працэнта дададуць да падатку на дывідэнды. Грошы пойдуць на фінансаванне сістэмы сацыяльнай абароны. Пасля каранавіруснага крызісу краіне неабходныя сродкі для аднаўлення аховы здароўя і аб'ёмаў дапамогі пенсіянерам.

Такім чынам, улады парушаць абяцанне не павышаць падаткі, прапісанае ў перадвыбарным маніфесце кіруючай Кансерватыўнай партыі ў 2019 годзе. Праціўнікі ініцыятывы назвалі рашэнне Джонсана «падатковай бомбай».

Паступленні ад новых збораў прынясуць бюджэту, паводле папярэдніх ацэнак, каля 10 мільярдаў фунтаў (14 мільярдаў долараў). Уплывовы прадстаўнік кансерватараў Джэйк Бэры параіў уладам перагледзець рашэнне і падумаць аб павышэнні падаходнага або карпаратыўнага падатку, што спаганяецца з кампаній, замест павелічэння страхавых узносаў.

# 17 ВЕРАСНЯ — СВЯТА

**Новае свята, прымеркаванае да даўняй, вядомай даты, — нагода задумацца пра значэнне памяці і ўласнай гісторыі. Пра тое, што замоўчванне яе старонак не бывае бясследным, што важна ведаць пра сябе саміх усё, ведаць праўду, і цаніць дасягненні продкаў. Тое, што краіна ў 1939 годзе аб'ядналася, стала адзіная — безумоўнае і бясспрэчнае дасягненне. Усё, што ладзіцца ўладамі і грамадскасцю дзеля напаміну пра гэту падзею, накіраванае не толькі ў мінулае, далёкае і нядаўняе, не толькі ў дзень сённяшні, але і ў будучае, — гэта заклік цаніць адзін аднаго і папярэджанне аб рызыцы раз'яднання, грамадскіх канфліктаў, сацыяльнай і палітычнай варожасці, страты дзяржаўнага суверэнітэту. Нам яшчэ трэба прыкласці намаганні, каб навучыцца слухаць і чуць адзін аднаго,**

## Пасланне да нашчадкаў

**У Гродне да Дня народнага адзінства на Кургане Славы будзе закладзена капсула часу, а на Старым мосце установяць сімвалічныя барэльефы.**



Курган Славы быў урачыста адкрыты 17 верасня 1969 года, да 30-годдзя аб'яднання Беларусі. Тады ж у нішу над памятнай плітой была закладзена капсула з пасланнем да нашчадкаў. Днямі яна была ўрачыста вынята, а яе тэкст стаў здабыткам для ўсёй гродзенскай грамадскасці. У прыватнасці, там ёсць такія радкі: «Гэты Курган насыпаны ў памяць мужных змагароў за аб'яднанне Заходняй Беларусі ў адзіную БССР. Ён — помнік тым, хто выратаваў Радзіму, выратаваў цывілізацыю ад карычневай чумы фашызму ў Вялікую Айчынную вайну».

Капсула з пасланнем перададзена на захаванне ў Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. А каб сувязь часоў не абарвалася, дадзены старт конкурсу на новае пасланне нашчадкам, якое таксама павінны абнародаваць праз 50 гадоў. Закладка новай капсулы часу адбудзецца ва ўрачыстай абстаноўцы 17 верасня 2021 года, у Дзень народнага адзінства на Кургане Славы.

— Дата, калі адбылося аб'яднанне беларускіх земляў, стала сімвалічнай у гісторыі беларускага народа. Але гэтыя здабыткі яшчэ трэба было адстаяць. Аб мужнасці герояў сведчыць і наш курган, куды прывозілі зямлю з брацкіх магіл воінаў і партызанаў з усіх раёнаў Гродзенскай вобласці. Мемарыял ператварыўся ў сапраўдную святыню, а капсула з пасланнем стала яшчэ адным напамінам, як важна зберагчы мір, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Ігар БУЛАЎКА.** — Патрыятычная акцыя пройдзе на Кургане Славы і аб'яднае ўсе пакаленні гродзенцаў. Спадзяюся, што сведкамі гэтых падзей роўна праз 50 гадоў стануць многія маладыя ўдзельнікі гэтай урачыстасці.

Ігар Булаўка расказаў, што цікавая акцыя будзе зладжана на Старым мосце ў Гродне. Яго гісторыя таксама звязаная з датай 17 верасня. Да 10-годдзя аб'яднання Беларусі было прымеркавана адкрыццё моста пасля капітальнага рамонту ў 1949 годзе. Аб гэтым сведчылі і адпаведныя барэльефы з абодвух яго бакоў. Яны знятыя падчас маштабнай рэканструкцыі аб'екта, і цяпер у аднаўленым выглядзе зноў зоймуць свае месца, як і 70 гадоў таму.

У Гродзенскай вобласці ў Дзень народнага адзінства будуць уведзены і новыя аб'екты. Напрыклад, у Скідзелі адкрыецца кіназала, у Смаргоні — шматкватэрны сацыяльны дом, у Карэлічах — абноўлены філіял раённай бібліятэкі. У Воранаве пачне дзейнічаць музейны пакой «Назад у СССР».

З'явяцца новыя памятныя знакі. Адзін з іх будзе ўстаноўлены на месцы закладкі будучага жылога комплексу мікрараёна Пагараны ў Гродне. А ў Шчучыне памятны знак з'явіцца на вуліцы 17 верасня і будзе сімвалізаваць Дзень народнага адзінства. Ва ўсіх раёнах вобласці ў гэты дзень будуць высаджаны алеі дружбы і адзінства.

Дзень горада — 680-годдзе ўтварэння — адзначаць 17 верасня Ашмяны. Тут будзе зладжана нямала ўрачыстасцяў. Па-першае, адкрыццё пляцоўкі дзяржаўнага сцяга з 18-метровым флагштокам. У квартале шматкватэрнай жылой забудовы з'явіцца новая пляцоўка для міні-футбола. Увогуле праграма свята тут расцягнута на два дні. У Гродне Дзень горада, які таксама прымеркаваны да 17 верасня, абяцае быць даволі насычаным. Гараджане атрымаюць у падарунак новыя аўтобусы. Імёны найлепшых гродзенцаў будуць занесены ў Кнігу славы Гродна. На вуліцы «17 верасня» пройдзе культурна-спартыўная праграма.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Ва ўсіх раёнах Брэсцкай вобласці рыхтуецца вялікая праграма святкавання Дня народнага адзінства. Да 17 верасня прымеркавана адкрыццё памятных дошак, абноўленага мемарыяла, музея. Конкурсы, флэшмобы, дыскусійныя пляцоўкі збяруць пераважна маладзёжную аўдыторыю. Будуць таксама традыцыйныя аўта- і велапрабегі.**

## Абноўленыя мемарыялы

Паводле інфармацыі **начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Таццяны ГАГАКАВАЙ,** адным з першых святочную праграму адкрываюць Баранавічы. У суботу, 11 верасня, тут адбудуцца велапрабег і атлетычны забег «За Беларусь». Аматары спорту і здаровага спосабу жыцця прысвячаюць свае старты дзяржаўнаму святу. 17 верасня ў сярэдняй школе № 1 Баранавіч адкрыюць музей народнага адзінства.

Моладзь горада рыхтуе форум па папулярызацыі сямейных каштоўнасцяў «Мы — адзіная сям'я» і актыўна ўдзельнічае ў гарадской інтэлектуальнай гульні QUIZ «У адзінстве народа — сіла дзяржавы».

Насычаная праграма мерапрыемстваў намечана ў Бярозе. Як вядома, да 1939-га тут знаходзіўся вельмі жорсткі канцэнтрацыйны лагер. Памятны знак на месцы лагера ўстаноўлены даўно, а цяпер правялі яго рэканструкцыю. І 17 верасня рэканструяваны мемарыял адкрыюць ва ўрачыстай абстаноўцы. Таксама ў будынку Чырвоных казармаў будзе адкрытая часовая музейная экспазіцыя «Канцлагер «Бяроза-Картузская». Вечарам у райцэнтры пройдзе святочны канцэрт, прысвечаны Дню народнага адзінства.

Конкурс патрыятычнай песні прымеркавалі да свята ў Брэсцкім раёне. Ён адбудзецца ў аграгарадку Чэрні, у раённым Доме культуры. У Брэсце флэшмобы, песенныя эстафеты, невялікія акцыі пройдуць у розных раёнах горада. У святочны дзень адбудзецца «ІІІ Берасцейскі дыялог» — форум з удзелам сталічных спікераў стане яшчэ адной дыскусійнай пляцоўкай на актуальныя тэмы.

На месцы пахавання воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі пры вызваленні Заходняй Беларусі ў 1939 годзе, будзе адкрыта мемарыяльная дошка. Пахаванне знаходзіцца ў гарадскім парку, на магіле стаіць помнік, але на яго пастаменце накрэслены толькі прозвішчы афіцэраў і салдат, якія загінулі ў гады Другой сусветнай вайны. Яны таксама там пахаваныя. Цяпер вось будзе адноўлена гістарычная справядлівасць, і з'явяцца імёны загінулых 1939 года. Каля помніка пройдзе памятнае мерапрыемства.

Як паведамляе ў сваім тэлеграм-канале **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК,** у гэты дзень у музеях Брэсцкай крэпасці, гісторыі горада і краязнаўчым музеі будзе дзейнічаць бясплатнае наведванне (акрамя экскурсійнага абслугоўвання).

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Душа народа — у яго сімвалах

**Яшчэ задоўга да Дня народнага адзінства — свята, якое ўпершыню праводзіцца ў нашай краіне 17 верасня, — на Міншчыне пачаліся шматлікія мерапрыемствы: аўтапрабегі, фестывалі, творчыя сустрэчы, выступленні самадзейных калектываў, спаборніцтвы, флэшмобы, сустрэчы кіраўніцтва вобласці і раёнаў з моладдзю, працоўнымі калектывамі, дыялогавыя пляцоўкі, патрыятычныя акцыі, акцыі па добраўпарадкаванні малой радзімы, тэматычныя кніжныя выстаўкі. Пра гэта расказалі «Звяздзе» ў галоўным упраўленні ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінаблвыканкама.**

Першага верасня ва ўсіх навучальных установах настаўнікі расказалі вучням аб гісторыі аб'яднання Заходняй Беларусі і БССР.

17 верасня ў Барысаве на Цэнтральнай плошчы пройдзе ўрачысты сход, прысвечаны Дню народнага адзінства, будуць працаваць разнастайныя пляцоўкі ў парку культуры і адпачынку, інтэрактыўная пляцоўка на праспекце Рэвалюцыі. У лёгкаатлетычным забегу возьмуць удзел усе ахвотныя розных узростаў і прафесій.

Шмат цікавага прапануе Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы. Гэта кніжная ілюстраваная выстаўка «Скарб народа Беларусі ў яднанні», «Душа Беларусі — у сімвалах яе», літаратурна-музычны вечар «Блаславёна будзь ты, родная зямля» і іншае.

У Старадарожскім раёне з першага верасня праходзіць патрыятычная акцыя «Наша сіла ў адзінстве», з 10 верасня — маладзёжны марафон «Шануем памяць нашых герояў», якія прадоўжацца і падчас свята народнага адзінства. На дыялогавай пляцоўцы з удзелам старшыні райвыканкама, спецыялістаў усе ахвотныя могуць выказацца наконт сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Жыхароў Старадарожчыны запрашаюць таксама ў літаратурна-музычную гасцёўню «Разам мы адзіныя», на лекцыю «Дзень, які нас аб'ядноўвае», мітынг-рэквіем з удзелам клуба рэканструктараў «Памяць».

У Капыльскім раёне можна паўдзельнічаць у лёгкаатлетычным забегу «За адзіную Беларусь».

Да святкавання Дня народнага адзінства актыўна падключыліся і бібліятэкі Стаўбцоўскага раёна, дзе адбудуцца кніжныя выстаўкі, патрыятычныя, інфармацыйныя гадзіны, экскурсы ў мінулае, круглыя сталы, тэматычныя гутаркі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**Ад сцен Брэсцкай крэпасці 3 верасня стартаваў рэспубліканскі аўтапрабег «Сімвал адзінства». Аўтакалона напярэдадні Дня народнага адзінства аб'едзе ўсю Беларусь. Кожны са 118 раёнаў перадасць удзельнікам імянны мяшэчак з зярнятамі, з якіх потым выпекуць каравай.**



Брэст.



Бяроза.

# ДЛЯ КОЖНАГА БЕЛАРУСА

**паважаць розныя меркаванні, шанаваць іншых і бачыць еднасць паміж усімі людзьмі, паміж усімі жыхарамі гэтай краіны, і паміж тымі, хто называе сабе беларусамі. Гэта першае такое свята на памяці большасці сучаснага пакалення, як яго святкаваць — мы яшчэ толькі пачынаем прыдумваць. У адных рэгіёнах ідэі нараджаюцца самі сабой, яны прадыктаваныя падзеямі на іх тэрыторыі, у іншых дапамагаюць творчы падыход, вопыт і жаданне арганізатараў закрануць сэрцы людзей. Без "уключэння" сэрца ніводнае мерапрыемства не будзе мець сэнсу. Няхай кожны знойдзе ў гэтыя дні і ў само 17 верасня для сябе асабісты сэнс. Ніжэй — пра асноўныя падзеі найбліжэйшых дзён на тэрыторыі ўсёй краіны.**

## Выстаўкі, спаборніцтвы, спектаклі

**Як паведамілі «Звяздзе» ў галоўным упраўленні ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама, напярэдадні і ў Дзень народнага адзінства ў беларускай сталіцы пройдзе шэраг разнастайных мерапрыемстваў, прысвечаных гэтай знамянальнай даце.**

На тыдні ў Мінску плануецца правядзенне дыялогавых пляцовак з удзелам мясцовых органаў кіравання, прадстаўнікоў грамадскасці. У бібліятэках горада пройдуць інфармацыйна-публіцыстычныя выстаўкі, прысвечаныя Дню народнага адзінства.

У сераду адбудзецца пашыранае пасяджэнне Мінскага гарадскога каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый па тэме «Адзіная Беларусь — моцная Беларусь!» з удзелам экспертаў-палітолагаў.

Чацвер для арганізацый і прадпрыемстваў горада стане днём інфармавання на тэму «Дзень народнага адзінства». А ў Мінскім гарадскім палацы культуры адбудуцца ўрачысты сход і канцэрт майстроў мастацтваў.

Увесь тыдзень да 17 верасня ў кінатэатрах Мінска — кінапраграмы і кінаўрокі «Памятныя даты нашай гісторыі». Пяць дзён у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі будуць ісці сумесныя тэматычныя тэатральныя праекты.

З 16 да 18 верасня на Плошчы Перамогі будзе праходзіць Вахта памяці на Пасту № 1.

Нарэшце, у сам дзень свята — 17 верасня — на пляцоўцы каля Стэлы Мінск — горад-герой адбудзецца гарадская дзіцяча-маладзёжная акцыя «Мы — адзіныя!» У гэты ж дзень у Лошыцкім сядзібна-паркавым комплексе пройдуць спаборніцтвы паміж падлеткамі і асобамі старэйшага ўзросту. Там жа адбудзецца музычны марафон (адкрыты конкурс інтэрнэт-чэленджаў) «Люблю Беларусь. Спяваю Беларусь».

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі адкрыецца выстаўка культуры і быту Беларусі «Ствараем прыгожае разам!»

Таксама святочныя мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх раёнах беларускай сталіцы.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

## Дзве новыя алеі

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Марына НАВІЦКАЯ запэўніла карэспандэнта «Звязды», што ўсе святочныя акцыі ў вобласці пастараюцца зрабіць вельмі цікавымі, таму цяжка вызначыць нешта асобна.**

16 верасня будзе рэалізаваны рэспубліканскі праект «Дзень добрых спраў» (навядуць парадак на сацыяльна значных аб'ектах). Закладка дзвюх алей — «Адзінства» і «Дружбы» — увогуле ажыццяўляецца на працягу месяца. У Наваполацку за пару дзён да свята пачнецца стварэнне тэматычнага мурала.

Ва ўстановах адукацыі правядуць урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню народнага адзінства (арт-панарамы, анлайн-марафоны, канцэртныя праграмы). Запланавана таксама правядзенне інфармацыйных і класных гадзін, выхаваўчых мерапрыемстваў (тэматычныя выставы ў музеях, конкурсы, віктарыны, экскурсіі, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, вядомымі людзьмі Віцебшчыны).

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі ў верасні ў «Сусветнай павуціне» вельмі актыўны ў папулярызацыі новага свята. У прыватнасці, праводзяцца флэшмобы «Беларусь — тэрыторыя адзінства», маладзёжны open-air #Сцяг, аўтарух #Джыптрыял, фотачэлендж.

Багатая спартыўная праграма. Ужо прайшла XIII міжгаліновая спартакіяда прафсаюзаў Віцебскай вобласці, прысвечаная Году народнага адзінства.

11 верасня — у Віцебскім раёне — аўтапрабег з удзелам членаў грамадскіх аб'яднанняў вобласці, у прыватнасці, Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, БРСМ, ДТСААФ. На 12 верасня запланавана правядзенне IV Віцебскага абласнога адкрытага шахматнага тэмпатурніру.

У асноўны дзень святкавання запланавана грамадзянска-патрыятычная акцыя «Мы — адзін народ, у нас адна краіна». Таксама 17 верасня ў канцэртнай зале «Віцебск» адбудзецца ўрачысты сход прадстаўнікоў працоўных калектываў, грамадскасці вобласці, прысвечаны Дню народнага адзінства.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Мурал, агульны каравай і поціскі рук

**Гомель да Дня народнага адзінства рыхтуецца ўпісаць у аблічча горада новыя сімвалы яднання народа.**

На адным з будынкаў цэнтральнага гомельскага праспекта мінакоў інтрыгуюць працэсам стварэння маштабнага мурала. Кампазіцыя плошчай 160 квадратных метраў адкрыецца ў сваёй поўнай велічы 17 верасня. Аўтары праекта — маладыя гомельскія мастакі, а ініцыятыва падтрыманая аблвыканкамам і гомельскімі прадпрыемствамі. Днямі мастакі пачалі працаваць над нанясеннем малюнка: у цэнтры кампазіцыі — вобраз жанчыны, якая трымае ў руках Беларусь. Галоўны пасыл мурала — «Мы — адно цэлае».

Між тым, за тыдзень да святкавання Дня народнага адзінства Гомельшчына прымае ўдзельнікаў рэспубліканскага аўтапрабегу-марафону «Сімвал адзінства». За тры дні патрыёты краіны, аб'яднаныя ў аўтакалону пад дзяржаўнымі сцягамі, праедуць больш за 900 кіламетраў, наведаюць знакавыя гістарычныя мясціны кожнага раёна вобласці.

Кожны раён перадасць удзельнікам аўтапрабегу мяшэчак са збожжам новага ўраджаю, потым з гэтых зярнятак плануюць спячы вялікі каравай — сімвал дружнай краіны.

Моладзь Гомельшчыны цяпер бярэ актыўны ўдзел у акцыі «Поціск рукі», да якой далучыўся рэгіён. Як падкрэсліваюць у Гомельскім абласным камітэце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, сутнасць акцыі — у сімвалічнасці поціску рукі як яднання нашага народа, нашай моладзі. Пры гэтым дзеянні ўдзельнікаў акцыі перадаецца Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Сама акцыя праходзіць у анлайн-фармаце, але ўсе сустрэчы і запіс поціскаў рукі праходзіць «ужывую». Для чэленджу выбіраюцца знакавыя для рэгіёна мясціны. У пачатку новага тыдня яго падхопяць усе раёны вобласці. Як удакладнілі ў абкаме, сцяг, які перадаюць удзельнікі акцыі, аб'ездзе ўсе раёны Гомельшчыны і ў Дзень народнага адзінства будзе перададзены ў музей Саюза моладзі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## І памятны знак...

«Мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня народнага адзінства, праводзяцца на Магілёўшчыне яшчэ са жніўня, — паведаміла «Звяздзе» **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА.** — Нашы рэгіянальныя СМІ прысвяцілі гэтай тэматыцы спецыяльныя рубрыкі. З 1 верасня ў вобласці праходзяць флэшмобы на тэму адзінства, фотачэленджы, у школах — інфармацыйныя гадзіны, арганізаваны конкурс дзіцячых эсэ і малюнкаў. Ва ўстановах культуры і адукацыі — канцэртныя, гульнявыя праграмы. У бібліятэках арганізавана работа тэматычных выставак, у кінатэатрах ладзяцца паказы фільмаў на зададзеную тэму. На працягу перадсвяточнага тыдня запланавана правядзенне дыялогавых пляцовак, круглых сталоў. Грамадскія аб'яднанні «Патрыёты Беларусі», БРСМ разам з рай-, гарвыканкамамі арганізоўваюць правядзенне аўтапрабегаў «Эстафета адзінства» і велапрабегаў. Вобласць возьме ўдзел у рэспубліканскім лёгкаатлетычным забегу «За адзіную Беларусь». Адбудзецца абласная канферэнцыя на тэму «Дзень народнага адзінства». 15 верасня ў Палацы культуры вобласці моладзь сустрэнецца з нашым вядомым параалімпійцам Аляксеем Талаем».

Напярэдадні Дня народнага адзінства ва ўсіх раёнах і гарадах Магілёўшчыны пройдуць адзіныя дні інфармавання на гэтую тэму, у рамках праекта «Дзень добрых спраў» будзе наводзіцца парадак на сацыяльна значных аб'ектах, дадала Кацярына Музычэнка. 16 верасня ў Палацы культуры вобласці пакажуць вялікі канцэрт, прымеркаваны да Дня народнага адзінства, а на само свята — 17 верасня — пройдуць урачыстыя мерапрыемствы і адкрыюцца новыя аб'екты. У Магілёве, напрыклад, каля гандлёва-забаўляльнага цэнтра «Атрыум» будзе ўстаноўлены памятны знак у гонар адзінства і адкрыецца дарога-дублёр.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**




Гродна.


Віцебск.


Шклоў.

Фота БелТА.

# Зацягнуўся рамонт...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Дзясяткі «звышнарматыўных» дамоў раскіданы па ўсім горадзе. Як расказалі ў КДК, усе яны знаходзяцца ў рознай ступені гатоўнасці. Ёсць такія, дзе капітальны рамонт завяршыўся літаральна нядаўна. Але большасць усё яшчэ ў стадыі будаўнічых работ. У пяціпавярховіку па вуліцы Савецкіх пагранічнікаў рамонт вядзецца ў адным з пад'ездаў. Сюды мы заходзім разам са Святланай, якая, уласна кажучы, і стала ініцыятарам рамонту.

— У нашым доме напачатку перакрылі дах. А потым жыхары вырашылі аднавіць і пад'езд, бо ён быў вельмі страшны, — расказала спадарожніца. — Зараз тут поўнасцю пабялілі столь і сцены, частка пойдзе пад афарбоўку. Але ў ЖЭСе пакуль затрымка з-за фарбы, работы спынены.

Як вядома, цяпер работы па рамонце пад'ездаў вядуцца за кошт саміх жыхароў. Святлана абышла суседзяў. Не ўсе пагадзіліся аплачваць. Для таго каб рашэнне было прынятае камунальнымі службамі, дастаткова згоды больш за палову жыхароў. У дадзеным выпадку так і адбылося. Людзі будуць аплачваць кошт работ часткамі на працягу пяці месяцаў. Калі такая перспектыва больш-менш зразумелая, застаецца пытанне па тэрмінах. На гэта звярнула ўвагу сям'я з дзецьмі, якая падымалася на пяты паверх. Маўляў, абяцалі, што зробяць за месяц, а ўжо трэці пайшоў. Святлана лічыць, што важны сам факт аднаўлення пад'езда. Усё ж такі дому больш за 70 гадоў, а калі быў апошні рамонт — ніхто не памятае.

А вось у трохпавярховым доме па гэтай жа вуліцы рамонт сапраўды перайшоў у хранічную форму. Работы вядуцца з 2019 года. Тады капітальны рамонт пачаўся з замены даху і аднаўлення фасада. На выгляд дом, які пабудаваны яшчэ ў сярэдзіне 50-х гадоў мінулага стагоддзя, даволі сучасны. Але аказалася, што камунікацыі таксама трэба мяняць. Такім чынам, у рамонт былі ўцягнуты многія службы, а праблемы сталі чапляцца адна за адну.

— Я пачала вывучаць пытанне капітальнага рамонту дома, і аказалася, што сюды ўваходзіць замена ўсіх камунікацый. Прыйшла камісія, паглядзелі, што ў нас трубы гнілыя, праводка старая, і тады наш дом уключылі ў план капітальнага рамонту, — расказала **член ініцыятыўнай групы дома Любоў ВАСІЛЕНКА.** — Зараз вядуцца работы ў кватэрах, працуюць сантэхнікі і электрыкі, а напярэдадні яшчэ работа газавай службы. Жыхарам прыйдзецца за свой кошт мяняць частку трубы. Аб гэтым мы даведаліся зусім нядаўна. Падчас замены трубы



Любоў ВАСІЛЕНКА каля дома па вуліцы Савецкіх пагранічнікаў.

будзе некаторы час адсутнічаць газ. Але канчатковых тэрмінаў рамонту мы пакуль не ведаем.

**Спецыяліст па тэхнагляду Гарадскога ЖКГ Ірына МІСЛІВЕЦ** не першы раз сутыкаецца з пытаннямі па гэтым доме. Ён першы ў горадзе, дзе плануецца замена газавых труб. У выніку будынак пераходзіць на цэнтральнае водазабеспячэнне, а газавыя калонкі ліквідуюцца.

Калі канкрэтна будуць завершаны работы, невядома. Па ўсёй бачнасці, не хутка. Гэта звязана з тым, што неабходна перарабіць праект рамонту з-за таго, што ўзнік шэраг дадатковых работ звыш закладзеных сродкаў. Экспертыза павінна выявіць канчатковую суму. У тым ліку вызначыць аб'ём работ, які будзе весціся за кошт саміх жыхароў.

— Увогуле, гэта даволі складаны працэс, бо адзін згодны, а другі — не, — заўважыла спецыяліст камунальнай службы. — Калі ідзе работа з жыхарамі, гэта заўсёды зацягваецца. Была праблема ў замене трубы ў перакрыцці за кошт жыхароў. Многія не пагаджаюцца плаціць, хоць сумы невялікія. З-за гэтага зацягваюцца тэрміны.

Па прычыне недакладнай праектна-каштарыснай дакументацыі завяршэнне рамонту часта адкладваецца — узнікае неабходнасць карэкціроўкі ўжо на стадыі работ. Гэта прыводзіць да падаражання аб'екта. Па інфармацыі КДК, кошт некаторых дадатковых работ складае 30 % ад першапачатковага кошту.

Па-ранейшаму існуе заганная практыка справаздачнасці аб быццам бы завершаным капітальным рамонце. Паўнавартасны ўвод у эксплуатацыю падменьваецца прыёмкай толькі першых пускавых комплексаў, тым часам работы на аб'екце працягваюцца. Напрыклад, па дакументах рамонт дома па вуліцы Гагарына завершаны. Але не трэба быць спецыялістам, каб заўважыць, што канчатковая кропка не пастаўлена. Будынак знаходзіцца ў рыштаваннях, у двары — будаўнічае смецце, стары шыфер. Усё гэта так і ляжыць тут з пачатку рамонту, патлумачыў Уладзімір, які пад'ехаў на аўтамабілі. Жыхар дома звяртае ўвагу на шэраг недаробак. Напрыклад, навесы над пад'ездамі не накрытыя, стаіць толькі металічны каркас. На былых кветніках не ўстаноўлена агароджа. У пад'ездзе няма святла на першым паверсе.

Цяпер у Гродне каля 20 жылых дамоў са звышнарматыўнымі тэрмінамі рамонту. Але такая сітуацыя не толькі ў абласным цэнтры. Падчас маніторынгу Гродзенскага раёна ў маі гэтага года таксама выявілі праблемныя аб'екты. Прычым справа датычылася яшчэ і няякаснага рамонту.

— У Новай Гожы Гродзенскага раёна летась праведзены рамонт пяціпавярховага жылога дома. Але кантрольны замер паказаў, што работы выкананыя няякасна — вада льецца фантанам са стыкаў стаякоў, — паведаміў **начальнік аддзела КДК Гродзенскай вобласці Мікалай КУЦ.** — Прыйшлося тэрмінова выклікаць падрадчыка для ліквідацыі прычын такой сітуацыі. Яны выязджалі, рамантавалі, але праз некалькі тыдняў мы зноў фіксавалі такі самы стан. Гэта сведчыць аб неахайным стаўленні да работы як заказчыкаў — ЖКГ, так і выканаўцаў. Па гэтым доме выявілі завышэнне рамонтных работ на суму каля 30 тысяч рублёў. Толькі пасля ўмяшання КДК усе непаладкі былі ліквідаваныя.

У Гродзенскай вобласці аб'ёмы капітальнага рамонту растуць, канстатуюць у КДК. Гэта абумоўлена як высокай колькасцю жылых дамоў, пабудаваных 40—50 гадоў таму, так і патрабаваннямі кіраўніка дзяржавы штогод рамантаваць 3 % жылога фонду, які знаходзіцца на балансе ЖКГ. Рамонты вядуцца, але далёка не ўсюды квадратныя метры своечасова ўводзяцца ў эксплуатацыю.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Надвор'е

# Лета не канчалася, яно проста злёгку адсунулася...

**У гэтыя выхадныя нас прыстойна прагрэе да плюс 27 градусаў**

**З сярэдзіны гэтага тыдня халоднае з замаразкамі надвор'е пакінула нашу краіну, і на змену яму з Заходняй Еўропы пачало паступаць цёплае паветра. У найбліжэйшыя выхадныя ўплываць на надвор'е па-ранейшаму будзе вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў цёплай паветранай масе. У асноўным будзе мала аблокаў, толькі ў нядзелю, калі на паўночны захад краіны падыдзе малаактыўны фронт, у гэтых раёнах павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Нядзеля стане люстраным адбіткам суботы. У гэты дзень будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у паўночна-заходніх раёнах месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні слабы з умацненнем да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 цяпла, а ўдзень — ад 22 да 27 градусаў са знакам плюс.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня на тэрыторыі Беларусі чакаецца ссоўванне халоднага франтальнага раздзела з Балтыйскага мора, які шмат ападкаў не прынясе, а вось цяпло пачне павольна перамяшчацца з тэрыторыі нашай краіны.

У панядзелак месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаюцца туманы. Тэмпература паветра ўначы складзе ўсе тыя ж 6—13 градусаў вышэй за нуль, месцамі да плюс 15 градусаў, удзень — 17—23 цяпла.

У аўторак месцамі, а ў дзённыя гадзіны па паўднёвым усходзе краіны на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 градусаў вышэй за нуль, удзень — 16—22 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Падаткі

# Пры зарплаце «ў канвертах» адгаворка «грыбы прадаваў» не дзейнічае

**Як паведаміла Галоўнае ўпраўленне развіцця падатковых органаў МПЗ, у міністэрства ёсць спецыяльныя падраздзяленні, якія праводзяць планамерную працу па выяўленні і прадухіленні фактаў выплаты «шэрай» заработнай платы.**

Так, у ходзе камеральнай праверкі, праведзенай інспекцыяй Міністэрства па падатках і зборах па Ленінскім раёне Магілёва, устаноўлена, што ў жыхара горада выдаткі пераўысілі атрыманыя даходы на 185,8 тысячы рублёў (больш за 74 тысяч долараў). Адкуль узялася такая сума выдаткаў?

У ходзе праверкі было ўстаноўлена, што апытаны грамадзянін часта даваў пазыкі іншым арганізацыям, якія былі зарэгістраваныя ў Расійскай Федэрацыі, а таксама набываў дарагую маёмасць без пацвярджэння крыніц даходаў.

Жыхар Магілёва факт зарплаты «ў канвертах» адмаўляў, а на пытанне «Адкуль грошы?» спрабаваў выкруціцца. Крыніцамі даходаў, згодна з прадстаўленай дэкларацыяй, з'явіліся даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці, звароты пазык арганізацыямі Расійскай Федэрацыі, дарэнне грашовых сродкаў ад блізкіх сваякоў і (!) рэалізацыя дзікарослай прадукцыі. Па выніках праведзеных кантрольных мерапрыемстваў факты атрымання грашовых сродкаў у выглядзе пазыкі, дарэння ад блізкіх сваякоў і ад рэалізацыі дзікарослай прадукцыі не пацвердзіліся.

Па выніках праверкі з сумы перавышэння вылічаны падаходны падатак у памеры 29,7 тысячы рублёў. Сума падатку паступіла ў бюджэт у поўным аб'ёме.

Бываюць выпадкі, калі ў поле зроку падатковых падраздзяленняў трапляюць індывіды, якія не плацяць падаткі, таму што ў іх наогул няма даходаў. Разам з тым яны жывуць нават вельмі добра.

У ходзе правядзення інспекцыяй па Барысаўскім раёне кантрольных мерапрыемстваў паводле запатрабавання дэкларацый аб даходах і маёмасці ў дачыненні да грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы, устаноўлена фізічная асоба, якая атрымлівае зарплату «ў канвертах».

Пры праверцы адпаведнасці даходаў і выдаткаў перавышэнне выдаткаў над даходамі ў гэтага фігуранта склала 88,28 тысячы рублёў. Натуральна, пасля гэтага выпадку інспекцыяй у апытанага чалавека была запатрабаваная дэкларацыя аб даходах і маёмасці. А пасля... заканамерны фінал. З сумы перавышэння выдаткаў над даходамі налічаны падаходны падатак у суме 14,13 тысячы рублёў.

Фінансы

# З дапамогай ільготнага крэдытавання

**будуць прадаваць айчынныя электрамабілі**

**Першымі на такі крок адважыліся фінансісты БПС-Ашчадбанка. Менавіта яны ўжо зараз збіраюцца даваць крэдыты на спецыяльных умовах на куплю сабраных у Беларусі электрамабіляў. Чакаецца, першай мадэллю роднага электракара стане Geometry C.**

Як адзначылі спецыялісты банка, крэдыты на электракары беларускай зборкі плануюць выдаваць па спецыяльнай «зялёнай» стаўцы, якая будзе значна ніжэйшая, чым бягучыя ўмовы па дзеючых крэдытных прапановах.

«У гэтым годзе наша фінансавая структура выразна абазначыла сваю прыхільнасць прынцыпам ESG, накіраваным на барацьбу са змяненнем клімату. Развіццё «зялёнай эканомікі» стала сапраўднай карпаратыўнай каштоўнасцю, — адзначыў **намеснік старшыні праўлення БПС-Ашчадбанка Алег БАРОДКА,** — таму банк патэнцыйна гатовы аказаць падтрымку ініцыятыве нашага даўняга партнёра «БелДжы» па выпуску электрамабіля і даць крэдыт на набыццё «электрычак» па зніжанай стаўцы. Такі крок паскорыць фарміраванне рынку электрамабіляў і палепшыць экалогію беларускіх гарадоў, а таксама ўмацуе пазіцыі банка як «кліматычнага лідара».

Як чакаецца, электрамабілі, што збіраюцца ў Беларусі, з'явяцца ў продажы ў канцы гэтага года. Першай мадэллю павінен стаць хэтчбэк Geely Geometry C. На адной падзарадцы гэты аўтамабіль зможа праехаць да 550 кіламетраў у залежнасці ад камплектацыі. Кошт новага аўтамабіля будзе пачынацца з 20 тысяч долараў.

Цікавасць да развіцця аўтапарка на электрацязе сугучны з нядаўна абвешчаным экапарадкам дня. Так, у чэрвені банк перайшоў на прынцыпы ESG — устойлівага развіцця з клопатам аб экалогіі. Цяпер у прыярытэце падтрымка праектаў, накіраваных на зніжэнне вугляроднага следу.

У 2018 годзе БПС-Ашчадбанк першым прапанаваў беларусам партнёрскую праграму, запушчаную сумесна з СЗАТ «БелДжы». Аўтакрэдыт «Geely з Ашчадным банкам» дазваляе набыць аўтамабіль Geely з бензінавым рухавіком на выгадных умовах: тэрмін атрымання пазыковых сродкаў да сямі гадоў з фіксаванай стаўкай 7 % гадавых у першыя два або тры гады (у залежнасці ад памеру ўзносу ўласнымі сродкамі). У наступным працэнтная стаўка складае стаўкі рэфінансавання, павялічанай на 9,77 %. Заяўка разглядаецца каля 30 хвілін.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

10 верасня 2021 г. № 35 (620)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


АКТУАЛЬНА

# ЧАМУ ГАРАДЖАНЕ ВЫБІРАЮЦЬ ВЁСКУ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Вязынцы прываблiваюць i славутыя лiтаратурныя мясцiны, i шыкоўная прырода.

## Самы вялікі попыт — на купалаўскія мясціны

У апошнія гады сярод нават карэнных гараджан стала папулярна абзаводзіцца загараднай нерухомасцю. І не ў новым катэджным пасёлку, а далей ад горада, у сапраўднай вёсцы. Ці хапае ўсім ахвотным участкаў, якія ёсць падводныя камяні пры набыцці на другасным рынку дома ў вёсцы — пра гэта і многае іншае расказаў Уладзімір ВАСІЛЬКОЎ, старшыня Радашковіцкага сельскага выканаўчага камітэта.

стар. 18

ПАРАДАК-2030

**Анатоль ІСАЧАНКА**:

# «УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОЖНАГА, І Ў ГЭТЫМ МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДЗІНЫЯ»

## У Мінску прайшло пасяджэнне Савета па ўстойлівым развіцці

**На ім Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця акцэнтаваў увагу удзельнікаў на тым, што гэта магчымасць падвесці вынікі работы нацыянальнай архітэктуры па дасягненні Мэт за справаздачны перыяд, а таксама вызначыць планы на перспектыву.**

У пасяджэнні Савета прымалі ўдзел члены Савета па ўстойлівым развіцці, краінавая каманда ААН, прадстаўнікі парламенцкай і партнёрскіх груп, грамадскіх аб'яднанняў і экспертнага асяроддзя, а таксама прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны.

У гутарцы з карэспандэнтам МС **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** падкрэсліла, што кожная Мэта ўстойлівага развіцця ўзаемазвязана з паказчыкамі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, якія знаходзяцца на пастаянным кантролі вертыкалі ўлады. Таму высокія паказчыкі дасягнення Мэт — гэта штодзённая планамерная работа ўсіх дзяржаўных органаў.

стар. 8

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## Дзеля развіцця міжпарламенцкага дыялогу

**Наталля Качанава павіншавала Прэзідэнта Федэральнага сената Нацыянальнага кангрэса Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія з нацыянальным святам.**

Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала Прэзідэнта Федэральнага сената Нацыянальнага кангрэса Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія Радрыга Атавіа Суарэса Пачэка з нацыянальным святам Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія — Днём Незалежнасці.

«Упэўненая, што развіццё канструктыўнага міжпарламенцкага дыялогу будзе садзейнічаць умацаванню ўзаемавыгаднага беларуска-бразільскага супрацоўніцтва і рэалізацыі яго значнага патэнцыялу», — гаворыцца ў віншаванні.

## Да Дня народнага адзінства

### Старшыня профільнай камісіі правёў арганізацыйную нараду

Днямі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч прыняў удзел у чарговай нарадзе па падрыхтоўцы мерапрыемстваў, прысвечаных Дню народнага адзінства, якая адбылася ў Нацыянальным гістарычным музеі.

У нарадзе прынялі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў культуры, інфармацыі, Белтэлерадыёкампаніі, Белтэлекама і іншых устаноў і арганізацый.

На сустрэчы абмяркоўваліся дэталі арганізацыі тэлемоста з рэгіянальнымі музеямі, праект сцэнарнага плана, склад удзельнікаў, а таксама канцэпцыя асвятлення мерапрыемстваў у сродках масавай інфармацыі.

## «Хатні гвалт: агульная характарыстыка і праблемы прафілактыкі»

### Сенатар узяў удзел у тэматычным круглым стале

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Русаковіч прыняў удзел у круглым стале «Хатні гвалт: агульная характарыстыка і праблемы прафілактыкі», які днямі адбыўся ў Палаце прадстаўнікоў.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, мэта мерапрыемства — павышэнне якасці падрыхтоўкі да разгляду Палатай прадстаўнікоў у другім чытанні праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях прафілактыкі правапарушэнняў».

## Саюзнае будаўніцтва

**Віктар Чайчыц прыняў удзел у пасяджэнні пастаянна дзеючага пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі семінара па пытаннях будаўніцтва Саюзнай дзяржавы на тэму «Удасканаленне прававых асноў міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння ў рамках Саюзнай дзяржавы ў эканамічнай і гуманітарнай сферах».**

Сенатар удзельнічаў у дыскусіях па пытаннях гуманітарнага супрацоўніцтва, развіцці патрыятычнага выхавання, адукацыі моладзі Саюзнай дзяржавы, узаемадзеяння маладзёжных арганізацый і рэалізацыі сумесных праектаў, рэгулявання працаўладкавання выпускнікоў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў як на тэрыторыі Беларусі, так і Расіі.

Удзельнікі мерапрыемства наведалі Смаленскі дзяржаўны ўніверсітэт спорту, дзе вучацца да трохсот студэнтаў з Беларусі. Гасцям паказалі спартыўныя залы, басейны, прадэманстравалі экспазіцыю музея ўніверсітэта і распавялі пра выдатных выпускнікоў ВНУ.

# «УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОЖНАГА, І Ў ГЭТЫМ МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДЗІНЫЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

У той жа час яна звярнула ўвагу на неабходнасць дасягнення Мэт на рэгіянальным узроўні, што дасць дадатковы імпульс для іх развіцця. У гэтым кантэксце яна адзначыла вопыт Магілёўскай вобласці, якім падзяліўся яе прадстаўнік на Савеце па ўстойлівым развіцці.

— Як сведчыць вопыт маіх паездак па краіне, рэгіёны патрабуюць раўнамернага развіцця, — перакананa яна. — Нельга ўсё сцягваць у сталіцу, абласныя цэнтры, неабходна ствараць працоўныя месцы, развіваць прадпрыемствы, прыцягваць інвестыцыі ў рэгіёнах.

На парадку дня савета было і яшчэ адно немалаважнае пытанне, цалкам звязанае з намаганнямі па дасягненні Мэт. Віцэ-спікер Савета Рэспублікі арыентаваў удзельнікаў на шчыры і сумленны дыялог па гэтай тэме:

— Нам неабходна таксама разгледзець пытанні разгорнутай супраць нашай краіны мэтанакіраванай кампаніі па палітычным і эканамічным ціску. Падобныя негатыўныя тэндэнцыі могуць паўплываць на дасягнутыя Рэспублікай Беларусь высокія вынікі ў розных сферах, у прыватнасці на працэсы дасягнення Мэт, — падкрэсліў Анатоль Ісачанка.




Як адзначыў намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нягледзячы на міжнародную сітуацыю, Беларусь, як і раней, адказна падыходзіць да выканання ўзятых на сябе абавязацельстваў па рэалізацыі Парадку-2030.

— Палітыка, якая рэалізуецца сёння ў Беларусі, і абраны нашым народам чвэрць стагоддзя таму курс, накіраваны на пабудову моцнай дзяржавы, у аснове якога ў першую чаргу інтарэсы чалавека, дазваляе штогод займаць Беларусі высокія месцы ў глабальным рэйтингу Мэт устойлівага развіцця, — перакананы Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт.

Нагадаем, што ў чэрвені 2020-га наша краіна займала 18-е месца ў адмысловым рэйтынгу па дасягненні Мэт, у якім удзельнічаюць 193 краіны. Гэта сведчыць аб тым, што Парадак-2030 выконваецца амаль на 80 працэнтаў.

Між іншым, другі блок выступленняў, які быў прысвечаны ўвядзенню краінамі калектыўнага Захаду аднабаковых і прымусовых санкцый, паказаў узаемасувязь дасягнення Мэт і Парадку-2030.

**Дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Арцём СІКОРСКІ** адзначыў, што абмежаванні на палёты ўплываюць на камфорт перасоўвання простых людзей — менавіта яны сталі ахвярамі заходніх санкцый. Ён патлумачыў: больш чым 60 % еўрапейскага рынку для беларускіх лётных кампаній становіцца недасягальным. У той жа час адбываецца пераарыентацыя напрамкаў палётаў, і цяпер павялічваецца колькасць рэйсаў па паўднёвым і ўсходніх напрамках для палётаў. Паводле яго слоў, ужо не хапае самалётаў на гэтых напрамках.

З другога боку, Парадак-2030 утрымлівае экалагічны кірунак, мэта якога — недапушчэнне кліматычных змен на планеце. У той жа час, адзначыў дырэктар Дэпартамента па авіяцыі, аблёт паветранымі судамі нашай краіны вымушае іх затрачваць ад 15 хвілін да паўгадзіны больш, на што, адпаведна, выдаткоўваецца паліва на тысячу літраў больш. Адсюль пытанне: як змагацца са шкоднымі выкідамі $CO_2$ у атмасферу, калі ўсё для гэтага робіцца?!

Між іншым, Арцём Сікорскі адзначыў, што падчас пандэмійных абмежаванняў, калі краіны раптам сталі «кожная сама за сябе», Рэспубліка Беларусь выконвала пастаўкі паветраным транспартам грузаў медыцынскага прызначэння ў інтарэсах усіх краін.

**Палітычны аглядальнік тэлеканала АНТ Ігар ТУР** перакананы, што ўсе санкцыйныя абмежаванні ў дачыненні да нашай краіны ў рэшце рэшт паўплываюць на змяншэнне пазіцыі Беларусі ў рэйтынгу дасягнення Мэт устойлівага развіцця.

> Рэгіёны патрабуюць раўнамернага развіцця. Нельга ўсё сцягваць у сталіцу, абласныя цэнтры, неабходна ствараць працоўныя месцы, развіваць прадпрыемствы, прыцягваць інвестыцыі ў рэгіёнах.

— Бо ўся дзяржаўная вертыкаль улады была занятая выкананнем Мэт устойлівага функцыянавання грамадства — і гэтыя мэты больш прыярытэтныя, — перакананы ён.

У якасці адэкватнай меры эксперт прапанаваў у наступных справаздачах па дасягненні Беларуссю Мэт адлюстроўваць і прычыны, якія паўплывалі на іх.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# НЕ БЫЦЬ РАЎНАДУШНЫМ

## Сенатар Таццяна РУНЕЦ правяла прыём грамадзян па асабістых пытаннях

**Да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах звярнуліся два чалавекі, праўда, пытанняў агучылі значна больш. Але ў аснове — іх цяперашнія даходы.**

Мінчаніна Алега Вацлававіча ў Савет Рэспублікі прывялі некалькі нагод: па-першае, як добразычлівага і сумленнага чалавека, яго хвалюе лёс аднаго мясцовага небаракі, які застаўся без жытла і працы і вымушаны начаваць на вуліцы непадалёк ад храма. Як дапамагчы чалавеку ў такім становішчы, сам заяўнік не ведае — вось і просіць далучыцца да вырашэння сітуацыі бадзягі, бо той самастойна наўрад ці з гэтым справіцца... Таццяна Рунец высветліла ўсе акалічнасці і даручыла кампетэнтным службам, у чыёй зоне адказнасці знаходзіцца гэтае пытанне, заняцца яго вырашэннем.

Як адзначыла сенатар у размове з карэспандэнтам «МС», гэты зварот сведчыць аб душэўнай дабрыні людзей:

— Мы вывучым сітуацыю, чаму грамадзянін аказаўся без месца жыхарства. Падключым органы ўнутраных спраў, сацыяльную службу раёна, паразмаўляем з служыцелямі храма, зробім усё магчымае, каб дапамагчы чалавеку, — запэўніла Таццяна Рунец.

Другая справа, якая прывяла пажылога мінчаніна на прыём да сенатара, датычыцца атрымання ім статусу ліквідатара аварыі на ЧАЭС. Мужчыне ўжо больш за 80 гадоў, але да нядаўняга часу ён працягваў сваю працоўную дзейнасць на розных пасадах у будаўнічай сферы. Алег Вацлававіч прыгадаў у размове са старшынёй профільнай камісіі, што ў свой час удзельнічаў у будаўніцтве розных аб'ектаў для перасяленцаў, але за ўстанаўленнем адпаведных даплат нікуды не звяртаўся, маўляў, на жыццё хапала. З выхадам на заслужаны адпачынак мужчына вырашыў вярнуцца да разгляду такой магчымасці.

Як патлумачыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсіённага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларыса ЯШКОВА**, для атрымання статусу ліквідатара аварыі на ЧАЭС неабходна дакументальнае пацвярджэнне ўдзелу ў работах па ліквідацыі наступстваў гэтай аварыі. Дарэчы, іншыя работы ў зоне, забруджанай радыяцыяй, ліквідацыйнымі лічыцца наўрад ці могуць.

Для высвятлення ўсіх акалічнасцяў будзе зроблены запыт у будаўнічую арганізацыю, дзе на той час працаваў мінчанін, аб наяўнасці камандзіровачных пасведчанняў у зону адчужэння і характары работы, якая там выконвалася.

Акрамя агучаных праблем, сталы мужчына выказаў незадаволенасць якасцю выкананых будаўнікамі работ па рамонце пад'езда дома, дзе ён жыве.

Усе пытанні дасканала разгледзяць з прыцягненнем адпаведных спецыялістаў, і да іх канчатковага вырашэння яны будуць знаходзіцца на кантролі сенатара.

Другая заяўніца прыехала з Маладзечна. Яна расказала сваю жыццёвую гісторыю з працаўладкаваннем і далейшай стратай работы. Сітуацыя, дарэчы, доўжыцца не адзін год: Алена Віталеўна намагаецца атрымаць месца ці ў стаматалагічнай паліклініцы, ці ў медыцынскім каледжы, дзе калісьці працавала. Цяпер яна ўжо пенсіянерка, але не губляе надзеі падзарабіць у гэтых установах.



**Начальнік кадравай і мабілізацыйнай работы галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Мінаблвыканкама Наталля ГУЧКО** патлумачыла: гісторыю жанчыны ведаюць, ёсць нават пастановы суда першай і другой інстанцый, куды яна звярталася па адмену рашэнняў наймальнікаў. Тая ж, у сваю чаргу, прасіла садзейнічаць аб далейшым разглядзе яе справы на больш высокім узроўні.

Таццяна Рунец запэўніла заяўніцу, што ўсё магчымае па яе звароце зробяць, а пытанне будзе знаходзіцца на кантролі ў верхняй палаце парламента.

— Кожны зварот у Савеце Рэспублікі разглядаецца вельмі ўважліва, вывучаюцца асаблівасці заяў, бо часам людзі прыходзяць з праблемамі, якія ўжо састарэлі, не могуць вырашыцца ў іншых дзяржаўных органах, — падсумавала вынікі сённяшняга прыёму грамадзян Таццяна Рунец.

Яна звярнула ўвагу на такую акалічнасць, як нераўнадушша заяўнікаў: многія з іх прыходзяць не толькі з праблемамі, але і з прапановамі па паляпшэнні работы дзяржорганаў, ідэямі па развіцці эканомікі краіны, паўнавартасным і шырокамаштабным асвятленні дасягненняў нашай краіны ў сродках масавай інфармацыі і гэтак далей.

— Што датычыцца аналізу характару зваротаў у Пастаянную камісію, яны звязаны ў большай ступені, безумоўна, з яе профілем — то-бок, сюды прыходзяць па вырашэнне эканамічных праблем, што адносяцца да сферы гандлю, страхавання, фінансавых паслуг і гэтак далей, — патлумачыла сенатар.

Дарэчы, вельмі паказальны вынік разгляду старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі аднаго звароту, які тры месяцы не мог знайсці станоўчага вырашэння і быў звязаны з атрыманнем заяўнікам грашовай кампенсацыі ў страхавой арганізацыі. Грамадзянін звярнуўся ў кампанію «Белдзяржстрах» па выпадку з яго прыпаркаваным аўтамабілем, які быў пашкоджаны каршэрынгавай машынай. Справа зацягнулася з прычыны, што заяўнік не мог атрымаць у ДАІ даведку аб ДТЗ.

— Дзве арганізацыі, якія знаходзіліся на тэрыторыі Мінска, не маглі дамовіцца і прадставіць адно адную неабходныя дакументы. Літаральна за два дні мы вырашылі гэтую праблему, і чалавек атрымаў адпаведную кампенсацыю, — прывяла сенатар у якасці прыкладу сітуацыю, якая была вырашана дзякуючы звароту ў Савет Рэспублікі.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

# ПРЫГАЖОСЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Сёння на тэлеканале АНТ у вячэрнім эфіры гледачоў чакае паказ фіналу XII Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2021». Вырашальнае шоу пройдзе 10 верасня ў Палацы спорту, дзе пераможніцу вызначыць журы, а пасля яна прадставіць Беларусь на конкурсе «Міс свету».**




Дзяўчаты, якія будуць спаборнічаць за тытул і карону, сур'ёзна рыхтуюцца да адказнага дня. Ён, як вядома, часам можа стаць стартам кар'еры, напрыклад у мадэльным бізнесе. Прыгажуні з розных абласцей нашай краіны, у тым ліку і са сталіцы, на працягу апошняга месяца старанна адточвалі сваё майстэрства дэфіле, прымяралі новыя вобразы, рыхтаваліся да творчых конкурсаў, працавалі над фізічнай формай, удзельнічалі ў фотасесіях, розных мерапрыемствах — адным словам, настройваліся на тое, каб у адзін з важных дзён свайго жыцця быць «на вышыні» і найлепшым чынам прэзентаваць сябе. Сярод удзельніц — 29 прадстаўніц розных тыпажоў і ўзростаў, прафесій і захапленняў. Патрабаванні да іх на стадыі адбораў, як і ў мінулыя гады, былі наступныя: узрост ад 18 да 24, рост не ніжэйшы за 174 см і знешнія даныя, а таксама статус «не замужам» і грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Каму ў выніку ўсміхнецца фартуна, прагназаваць не бяромся, але ж, думаем, кожная з дзяўчат верыць і спадзяецца на ўласную перамогу. Што ж, паглядзім, чые прагнозы спраўдзяцца сёння ўвечары. Пачатак шоу «Міс Беларусь — 2021» у 21.15 на АНТ.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 128

Сваю задачу прапануе Павел Задаяны з Брэста *(гл. дыяграму)*.




Белыя: Крb6, Фf2, Са3, Сg2, Кd3, пп. g5, g6 (7).

Чорныя: Кре6. Ле4, Сg8, пd4 (4).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У выпуску ад 13 жніўня мы змясцілі два эцюды Віктара Жука і Васіля Тупіка. Аўтары ўдасканалілі першы з іх і прапануюць такую пазіцыю.

Белыя: Кра2, Ле5, пп. b3, c3, d5, g6 (6).

Чорныя: Крb5, Лf1, Кd3, пп. c4, c7, e6 (6).

Выйгрыш

1. de К:e5 2. e7 cb+ 3. Кр:b3 К:g6 4. e8Ф+ Крc5 5. Ф:g6. Пераставім пе6 на е7: 1. d6+ К:e5 2. de cb+ 3. Кр:b3 К:g6 4. e8Ф+. Але больш цікавае рашэнне пры наступных умовах.

Белыя: Кра2, Ле5, пп. b3, c3, d5, g5 (6).

Чорныя: Крb5, Лf1, Кd3, пп. c4, c7, e7 (6).

1. d6+ К:e5 2. de cb+ 3. Кр:b3 Лb1+ 4. Кра2 (або 4. Крс2) Лb2+ 5. Кра1.

А ў гэтай пазіцыі — нічыя.

Белыя: Кра2, Ле5, Сh7, пп. c3, d5 (5).

Чорныя: Крb5, Лf1, Кc5, пп. c7, d3, e7 (6).

1. С:d3+ К:d3 2. d6+ К:e5 3. de Лf2+ 4. Крb1 Лf1+ 5. Крc2 Лf2+.

* * *

У Гродне прайшлі чарговыя юнацкія і дзявочыя першынствы Беларусі па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы. Сярод юнакоў да 12 гадоў у рапідзе перамог Радзвіон Сідарэня, у бліцы — Аляксандр Гвоздзь, да 14 гадоў — адпаведна Міхей Навуменка і Арцём Бяляўскі, да 16 гадоў — Ягор Сіліч і Арцём Сіняўскі. Сярод дзяўчат: да 12 гадоў — Маргарыта Бендзік і Варвара Мацкевіч, да 14 гадоў — Ксенія Норман і Юлія Лявонава, да 16 гадоў — Варвара Палякова (у абодвух відах праграмы).

* * *

Міжнародная шахматная федэрацыя другі год запар ладзіць сусветную анлайн-алімпіяду. Беларуская зборная сёлета пачала гэты шматступеньчаты турнір з другога дывізіёна, дзе ў групе «С» заняла другое месца і выйшла ў наступны этап. Нашы суайчыннікі з лікам 6:0 перамаглі Чарнагорыю і Шатландыю, 5,5:0,5 — Зімбабвэ, 4,5:1,5 — Швецыю, Нарвегію, Партугалію, Шры-Ланку і Албанію, а саступілі толькі Ізраілю — 2,5:3,5. Дарэчы, Яна Ільючык набрала 7 ачкоў з 7. Мы яшчэ вернемся да згаданай тэмы.

Яна Ільючык — Мауд Радсмоен. 1. e4 c5 2. Кf3 e6 3. d4 cd 4. К:d4 Кc6 5. Кc3 Фc7 6. Се3 a6 7. Сd3 Кf6 8. 0-0 Кe5 9. h3 К:d3 10. Ф:d3 Се7 11. f4 d6 12. Лае1 0-0 13. Сc1 b5 14. e5 de 15. fe Кd7 16. Крh1 Сb7 17. Сf4 Кc5 18. Фg3 Лfd8 19. Кf3 b4 20. Кd1 Кe4 21. Л:e4 С:e4 22. Кe3 Сg6 23. h4 h5 24. Сg5 С:g5 25. К:g5 Фc6 26. Лf4 a5 27. Кc4 Лd1+ 28. Крh2 Фc5 29. Кe3 Лаd8 30. К:d1 Л:d1 31. Лf2 Фd4 32. c3 bc 33. bc Фd5 34. Лb2 Крf8 35. Лb8+ Кре7 36. Фе3 Фc6 37. Фа7+ Лd7 38. Ф:a5 Лb7 39. Фd8x

Кірыл Ступак — Нікола Патпара. 1. d4 Кf6 2. g3 c5 3. d5 d6 4. c4 g6 5. Кc3 Сg7 6. Сg2 0-0 7. Кf3 e6 8. 0-0 ed 9. cd Ле8 10. Сf4 Сf5 11. Кh4 Сg4 12. Фb3 Кa6 13. e4 Кc7 14. h3 Сc8 15. a4 a6 16. Лfe1 Кh5 17. Се3 Лb8 18. Фb6 Фe7 19. g4 Ф:h4 20. Ф:c7 С:g4 21. hg Ф:g4 22. Ф:d6 Се5 23. Ф:c5 f5 24. ef Лbc8 25. Фа5 gf 26. d6 f4 27. Фd5+ Крf8 28. d7 fe 29. deФ+ Л:e8 30. Фf3+, 1:0.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Сf5. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Сядзі і глядзі

# Вайна без грыфа «сакрэтна»

**На «Беларусь 1» пачалі паказ мастацка-публіцыстычнага праекта «Партызанскі рубеж», які стаў другой часткай ваеннай трылогіі Белтэлерадыёкампаніі (пачатак ёй быў пакладзены ў маі праектам «Крылы Перамогі»). Гэтым разам тэлеаўдыторыю чакаюць 12 серый пра подзвігі народнага супраціўлення на акупаваных нямецкімі захопнікамі землях у гады вайны.**




Фота з архіва Белтэлерадыёкампаніі.

Асновай сцэнарыя праекта сталі нядаўна рассакрэчаныя дакументы з расійскіх і беларускіх архіваў. Напрыклад, у першай прэм'ернай серыі аўтары «Партызанскага рубяжа» робяць аналіз 1938 года і дзеянняў савецкіх уладаў на фоне таго, як рэйх далучыў да сябе Аўстрыю, а ў дыпламатычных колах гучала інфармацыя пра перадзел Еўропы...

Аповед працягласцю ў 156 хвілін, што атрымаўся з архіўных матэрыялаў, складаецца з шэрага дакументаў — інструкцый, указаў і г. д. Варта адзначыць, што ў кожнай серыі стваральнікі прытрымліваюцца галоўнага прынцыпу — падаваць інфармацыю дакладна. Аналіз архіўных дакументаў робіць тут не журналіст, а гісторык, уладальніца медаля Францыска Скарыны Наталля Голубева, на рахунку якой ужо не адзін дзясятак дакументальных фільмаў. У адным з нядаўніх інтэрв'ю на «Беларусь 1» напярэдадні старту новага праекта (у ім яна задзейнічана і як сцэнарыст) Наталля Аляксандраўна адзначыла, што мэта новага цыкла — дапоўніць веды аўдыторыі пра тое, што адбывалася на тэрыторыі беларускіх зямель у ваенны час і наколькі важны быў партызанскі рубеж у кантэксце агульнай перамогі над ворагам: «Мы ўпершыню прадставім арыгінальныя допыты калабарантаў, якіх лавілі, каго ў Польшчы, каго ў Чэхіі, а каго ў беларускіх лясах... Людзі, якія асэнсавана ішлі забіваць іншых. І якія б апраўданні ні прыводзіліся, гэта быў генацыд беларускага народа. І ў ім, на жаль, брала ўдзел пэўная частка беларускага насельніцтва. Нямецкія дакументы, што распавядаюць пра ўзаемадзеянне нямецкага кіраўніцтва і калабарацыі, рассакрэчаныя. І гэта ўсё мы ўбачым».

А вось галоўным апавядальнікам ваеннай трылогіі выступае акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст БССР Уладзімір Мішчанчук. Напярэдадні прэм'ернага паказу артыст адзначыў, што ў працэсе работы ён адкрывае і для сябе факты, якія дагэтуль не ведаў, хоць пра тыя падзеі яму расказвалі некалі яго бацькі.

Навінка ад творчай групы медыяхолдынга з дапамогай эксклюзіўных і раней невядомых звестак раскажа сапраўдную гісторыю партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі — ад стварэння першых спецыялізаваных школ у 1938 годзе да ўдзелу народных атрадаў у разгроме верхматаўскай групы армій «Цэнтр».

Для здымак працягу ваенна-гістарычнага цыкла ў найбуйнейшай студыі Белтэлерадыёкампаніі на 600 метраў «аднавілі» партызанскі лагер, стварыўшы натуралістычныя дэкарацыі.

У найбліжэйшых серыях праекта тэлегледачы даведаюцца пра змест «чырвоных папак» і пра сакрэтныя планы камандуючых савецкай арміяй на выпадак «Навальніцы» — прамой пагрозы ваеннага ўмяшання гітлераўцаў. Таксама нам раскажуць пра баявыя поспехі партызанскага руху і яго знакамітых лідараў — Васіля Каржа, Ціхана Бумажкова, Фёдара Паўлоўскага, Міная Шмырова, Аляксандра Далідовіча і іншых камандзіраў першых атрадаў.

Праект «Партызанскі рубеж» выходзіць у вячэрнім эфіры тэлеканала «Беларусь 1» адразу пасля выпуску «Панарамы». Калі ж з нейкіх прычын вы не паспееце паглядзець тую ці іншую серыю, знайсці іх можна на афіцыяльным сайце медыяхолдынга www.tvr.by пасля выхаду ў тэлеэфіры.

**Алена ДРАПКО.**


## «Смачная восень са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або ІІ паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 14 кастрычніка 2021 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 22 кастрычніка 2021 года будуць разыграны 7 тостараў Galaxy GL 2909 і суперпрыз — мультыварка Holt HT-MC-005. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 30 кастрычніка 2021 г.





Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2021 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або ІІ паўгоддзе 2021 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 164 газеты «Звязда» ад 27.08.2021 года.

**Тэлефон для даведак (017) 271 81 53.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.2021 да 31.12.2021.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4064 ад 20.08.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або ІІ паўгоддзе 2021 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
*(аддзяленне сувязі)*

______________________ **на IV квартал або ІІ паўгоддзе 2021 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.10 Драма «Сляды ў мінулае» (16+).**
**7.55** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.40** Гісторыі выратавання (12+).
**10.15** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**10.50** Маршрут пабудаваны (12+).
**11.30** «Пытанне нумар адзін».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Драма «Домік на шчасце-2» (16+).**
**14.30** Адзін дзень (12+).
**15.15** Вакол планеты.
**15.55** «Нагода ёсць» (12+).
**16.30** «Партызанскі рубеж» (12+).
**16.45, 19.10 Драма «Шкляны пакой» (16+).**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.30 Драма «Выкрадзенае шчасце» (12+).**

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень». Ранішняе шоу (12+).
**8.00, 16.25** Тэлебарометр.
**8.05 «Клон». Серыял (16+).**
**10.00** «Паненка-сялянка» (16+).
**11.00 Прыгода «Прагулка» (12+).**
**13.20** «На нажах» (16+).
**14.25** «Тата папаў» (16+).
**17.00, 22.00** Тэніс. Кубак Дэвіса. Аргенціна — Беларусь.
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНА.

## Беларусь 3

**7.25** «Святыні Беларусі».
**7.50, 12.25** Навіны культуры.
**8.10** «Правілы геймера». Мастацкі фільм (6+) [СЦ].
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Лешч, запечаны ў гліне.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50** «Сваімі словамі».
**12.45** «Кадры жыцця». Актрыса тэатра і кіно Алена Дубровская.
**13.40, 14.05** «Вялікае кіно. «Я крочу па Маскве». Дакументальны фільм (12+) [СЦ].
**15.20** «УНОВИС». Дак. фільм (12+) [СЦ].
**16.15** Гала-канцэрт «Мы — народ...»
**17.55 «Вадзіцель аўтобуса». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].**
**20.15** «Кафедра».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Вясковы дэтэктыў». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].**
**22.30 «Анiскін і Фантамас». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].**



## Беларусь 5

**7.00** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. «СКА-Мінск» — «Мяшкоў-Брэст».
**8.20** Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» (Уфа) — «Дынама-Мінск».
**10.15** Тэніс. Кубак Дэвіса. Аргенціна — Беларусь.
**11.50** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету.
**13.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металлург» (Жлобін) — ХК «Брэст».
**16.00, 23.40** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі.
**17.50** Піт стоп.
**18.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**20.30** Вынікі тыдня.
**21.20** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**0.20** Плаванне. Ліга ISL.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
**7.10** «Здароўе» (16+).
**8.10** «Жыццё іншых» (12+).
**9.10** «Метэагід».
**9.30** «Раніца за вечар мудрэйшая» (12+).
**10.05** «Уладзімір Мяньшоў. «Хто сказаў: «У мяне няма недахопаў?» (12+)
**11.05** «Ці бачылі відэа?» (6+)
**13.20** Да 70-годдзя Аляксандра Разенбаўма. «Сны каля руховага дрэва» (16+).
**14.20** «Аляксандр Разенбаум. Мой дзіўны сон» (16+).
**16.20** «Тры акорды» (16+).
**18.20** «Лепш за ўсіх!» (0+)
**20.00** Контуры.
**21.35 Серыял «Каця і Блэк» (16+).**
**23.35** «Спартклуб» (16+).
**23.55 Серыял «Забойная сіла» (16+).**

## СТБ

**6.20, 23.25** «Халасцякі». Серыял (16+).
**7.50, 22.35** Дакументальны праект (16+).
**9.05** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**11.00, 13.40, 16.40, 21.05 «Баец». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.30** «Тыдзень».
**0.55** «Засакрэчаныя спісы» (16+).

## МІР

**5.00** М/ф.
**7.05 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі» (16+).**
**8.50** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**9.25** «ФазэндаЛайф» (16+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10, 16.15, 19.30, 1.00** Серыял «Экспрапрыятар» (16+).
**18.30, 0.00** «Разам».

## РТР—Беларусь

**7.05 Фільм «Любіць ворага» (12+).**
**10.40** «Ранішняя пошта з Мікалаем Баскавым».
**11.15 Фільм «Вылячэнне» (12+).**
**14.50** «Парад гумару» (16+).
**16.30 Фільм «Уцякачка-2» (12+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** «У людзях».
**21.50 Фільм «Позняе шчасце» (12+).**
**23.35** Масква. Крэмль. Пуцін.
**0.15** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** «Гарады Беларусі» (6+).
**6.45** Беларусь (6+).
**7.25** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Погляд на Беларусь» (12+).
**8.40** «Хто ў доме гаспадар?» (12+)
**9.20** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.25** «Кватэрнае пытанне. BY» (12+).
**11.00** «Першая перадача» (16+).
**11.30** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.20** «Дачны адказ» (0+).
**13.25** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.20 Фільм «Тонкая штучка» (16+).**



**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.00** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05** «Ты супер!» (6+)
**22.30** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**23.00** «Зоркі сышліся» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.20, 20.00, 21.05, 1.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад «Творцы сноў».
**8.25 Камедыя «Гісторыя двух кошачак» (6+).**
**9.50** «Хачу ў Парыж».
**9.55** «Гатуй як шэф» (12+).
**10.00 Драма «Казанова».**
**11.40 Прыгоды «Глыбокае сіняе мора» (16+).**
**13.20 Камедыя «Апошні волат» (0+).**
**15.15** «АльфаБет».
**15.25** «Індыяна Джонс і апошні Крыжовы паход» (6+).
**17.45 Дэтэктыў «Злачынствы страсці» (16+).**
**19.15** «Суперлато».
**20.05 Серыял «Дылер» (12+).**
**20.55** «Вечарніца» «Пчолка Мая» (0+).
**21.10 Драма «Аднойчы ў Амерыцы» (16+).**





## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00, 14.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**10.10** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**10.40** «Дурні і дарогі» (16+).
**11.50, 22.45** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**12.55** «Уральскія пельмені» (16+).
**16.00** Серыял «Вароніны» (12+).
**18.00, 19.30** Серыял «Гранд» (16+).
**20.55. 21.00** Камедыя «Superнянь» (16+).
**0.00** Серыял «Анжаліка» (16+).
**1.00** Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).
**2.50** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**4.25** «Адна за ўсіх» (16+).
**5.10** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.50** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква Бове.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 0.50** «Сакрэты старажытных мегаполісаў. Александрыя». Дакументальны фільм [СЦ].
**8.40** «Разведка ў асобах. Нелегалы. Мемуары». Дакументальны фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10** ХХ стагоддзе. «На ўсе часы. Яўген і Таццяна Самойлавы».
**12.10** «Забытае рамяство». Дакументальны серыял.
**12.25** «Шахеразада». Серыял.
**13.25** Колер часу. Надзя Рушава.
**13.35** 70 гадоў Аляксандру Разенбаўму. Лінія жыцця [СЦ].
**14.30** «Хаджэнне Кутузава за мора». Дакументальны серыял [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. АРТ.
**15.20** «Агора».
**16.25** Да 70-годдзя з дня нараджэння Сяргея Арцыбашава. «Хуліган з Пакроўкі». Дакументальны фільм [СЦ].
**17.05** Колер часу. Анры Маціс.
**17.20** «Маскоўская кансерваторыя. Музычная гісторыя». Дакументальны серыял.
**17.45** Гістарычныя канцэрты. Наталля Гутман, Алег Каган, Генадзь Раждзэственскі і Дзяржаўны сімфанічны аркестр Міністэрства культуры СССР.
**18.35** Прыступкі цывілізацыі. «Сакрэты старажытных мегаполісаў. Александрыя». Дакументальны фільм [СЦ].
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Сімфанічны раман». Серыял [СЦ].
**21.30** «Саці. Нясумная класіка...»
**22.15** «Адлюстраваны час». Дакументальны серыял [СЦ].
**22.45** «Джонатан Стрэндж і містар Норэл». Серыял [СЦ].
**0.10** Да 80-годдзя акцёра. «Дрэйдэн. Прадстаўленне». Дакументальны фільм.
**1.45** «Маскоўская кансерваторыя. Музычная гісторыя». Дакументальны серыял.
**2.15** «Ігнат Сцялецкі. Таямніца падземных палат». Дакументальны фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00** «Аншлаг! Аншлаг!» (16+)
**6.55** «Рок-н-рол ТБ» (16+).
**7.35, 13.25, 15.40. 17.25, 18.50, 20.45, 21.40, 23.00, 1.10, 2.45, 3.40, 5.40** Музычная настальгія (12+).
**7.55** Фільм-канцэрт «Чатыры інтэрв'ю з зімой» (12+).
**9.00** «Быў час» (16+).
**10.00** Маст. фільм «Божае стварэнне» (18+).
**11.20, 23.20, 5.00** «Блефклуб» (16+).
**12.00** «Пад знакам задыяка. Цялец» (12+).
**13.35** «Праграма А» (18+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00** Маст. фільм «Зладзеі ў законе» (18+).
**18.00** «СевАлогія» (18+).
**19.10** «Майстры мастацтваў». Народная артыстка СССР Фаіна Георгіеўна Раневская (12+).
**22.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**0.00** «Да і пасля...» (16+)
**1.20** Маст. фільм «Нябесны ўзрост» (16+).
**4.00** «Колба часу» (12+).

## EuroSport 1

**2.15, 18.30, 19.00, 19.30, 21.00, 22.00, 23.00** Тэлечасопіс (16+).
**2.20, 7.00, 11.00** Тэніс. US Open. Жанчыны (6+).
**4.00, 17.00, 23.05** Веласпорт. ЧЕ. Трэнціна. Мужчыны (16+).
**5.30, 12.00** Тэніс. US Open. Мужчыны (6+).
**8.30** Веласпорт. Тур Брытаніі (16+).
**9.30, 15.30** Веласпорт. ЧЕ. Жанчыны (16+).
**13.30, 14.30** Вясляры слалам. Кубак свету (6+).

## Кінакамедыя

**1.20** «Чаго хоча дзяўчына» (12+).
**3.10** «Начное жыццё» (16+).
**5.15** «Нічога не бачу, нічога не чую» (16+).
**7.10** «Колькі ў цябе?» (16+)
**9.10** «Кадры» (12+).
**11.25** «Што магло быць горш?» (12+)
**13.15** «Як адмыць мільён» (12+).
**15.35** «Бібліятэкар: у пошуках дзіды лёсу» (16+).
**17.30** «Модная штучка» (12+).
**19.30** «Ружовая Пантэра» (12+).
**21.10** «Вялікі тата» (12+).
**22.50** «Робін Гуд: мужчыны ў трыко» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.45** «Зграя» (16+).
**10.40** «M & S» (12+).
**11.15** «Перыскоп» (16+).
**11.35** «Глядзі сам» (16+).
**11.55** «Доктар І».
**12.30, 18.00, 2.55** «Сляпая» (16+).
**13.40, 19.10** «Варажбітка» (16+).
**14.55** «Сакрэты» (16+).
**15.30** «Пагляддзім» (12+).
**16.10** «Як вярнуць мужа за трыццаць дзён» (12+).
**20.20** «Паляўнічы на прывідаў. Дакументаліст» (16+).
**21.30** «Следства па целе». Серыял (16+).
**0.15** «Развітанне» (16+).
**1.05** «Дружыннікі» (16+).
**3.50** «Пецярбургскія таямніцы сям'і Баярскіх» (12+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Доктар Хаус (16+).
**6.35** Забытае (16+).
**8.15** Страшна прыгожы (16+).
**9.55** Акадэмія вампіраў (16+).
**11.45** Монстры на канікулах (6+).
**13.25** Монстры на канікулах-2 (6+).
**15.00** Інтэрв'ю з вампірам (16+).
**19.00** Таксі (16+).
**20.35** Таксі-2 (12+).
**22.10** Таксі-3 (16+).
**23.45** Таксі-4 (12+)
**1.25** Нявеста, якая збегла (16+).
**3.15** Вяселле лепшага сябра (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Брат (16+).
**7.10** Брат-2 (16+).
**9.30** Ваўкадаў з роду Шэрых Сабак (16+).
**12.05** Мажор (16+).
**13.55** Сэлфі (16+).
**16.00, 17.00** За гадзіну да світання (16+).
**18.00, 18.55** Чырвоная каралева (16+).
**20.00** Кіроўца для Веры (16+).
**22.05** Стылягі (16+).
**0.35** Адэса (18+).
**2.40** Адзінка (12+).
**4.25** Рубеж (12+).

## National Geographic

**6.00, 5.10** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25, 12.25, 16.45** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**7.15** Незвычайныя промыслы (16+).
**8.05** Непакорлівы востраў (16+).
**8.55, 9.45** Аўта-SOS (16+).
**10.40, 11.30** Дзікі тунец (16+).
**13.15, 14.10** Асушыць акіян (16+).
**15.05** Ліхтугі за мяжой (16+).
**15.55** Наркавойны (16+).
**17.40** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**18.30, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**19.15, 20.05** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 21.50, 2.45** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**22.45** Настольная кніга дыктатара (16+).
**23.40** Дасследчык 2.0 (16+).
**0.30, 0.55** Гарачыя граніцы (16+).
**1.15** Мяжа (16+).
**2.00, 3.35** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**4.20** Ледзяная дарога (16+).
**5.35** Гульні розуму (16+).

## Discovery

**8.00, 7.35** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10, 23.05, 1.50, 2.45, 3.40, 5.14** Махінатары (12+).
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Каралі аўкцыёнаў (12+).
**10.15, 10.40, 21.15, 21.40** Як гэта ўладкавана? (12+)
**12.05** Смяротны улоў (16+).
**13.00** Аляска: апошні рубеж (16+).
**13.55, 14.50** Рэальныя дальнабойшчыкі (16+).
**15.45** Ратавальнікі-цяжкавагавікі (12+).
**17.35** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (12+).
**0.00, 6.01** Невядомая экспедыцыя (12+).
**0.55, 6.48** Геній аўтадызайну (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

# аўторак, 14 верасня



### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**8.50** Слова біскупа Казіміра Велікасельца на свята Узвышэння Святога Крыжа.
**9.10, 22.40 Серыял «След» (16+).**
**10.55** «Скажынемаўчы».
**11.50, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Заві мяне мамай» (16+).**
**13.55** «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.40, 15.25 Драма «Бумеранг» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.45** Гэта іншае.
**22.05** «Рубеж» (12+).
**22.35** Беларуская супержанчына.
**0.30** Сфера інтарэсаў.
**1.10** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
**9.00, 16.55** Тэлебарометр.
**9.05** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**10.20, 22.40** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.20, 18.15 Серыял «Сінічка» (16+).**
**13.15** «На тыдзень» (16+).
**14.10** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.50** «Паненка-сялянка» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 «Клон». Серыял (16+).**
**17.50** «Каралі палат» (16+).
**20.10 Серыял «Сляпая» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.25** «Трэці лішні» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Курыца, запечаная ў цесце.
**8.05, 12.00, 23.30** Навіны культуры.
**8.25** «Размовы пра духоўнае». Узвышэнне Святога Крыжа.
**8.35, 17.10 «Вечны кліч». Серыял (12+) [СЦ].**
**10.50** «Кадры жыцця». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Мішчанчук.
**11.40** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**12.20** «Беларуская кухня». Пірог з трусяцінай.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05** «Апошні дзень». Андрэй Растоцкі (12+) [СЦ].
**13.55, 21.40 «Бармен з «Залатога якара». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].**
**15.10** «Славянскі базар у Віцебску — 2018». Адкрыццё.
**16.35** «Люблю і памятаю».
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)

### Беларусь 5

**7.00, 8.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**9.50** На грані фолу.
**11.15** Плаванне. Ліга ISL.
**13.20** Гульні «на вырост».
**13.50, 18.20, 21.20** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**15.50** Піт-стоп.
**16.20, 23.30** Міні-футбол. Чэмпіянат свету.
**20.20** Вось гэта спорт!
**20.40** Спорт-кадр.
**21.10, 23.20** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.20 Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15 Серыял «Спытайце медсястру» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.30, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Глядзець усім» (16+).
**9.30** «Па сутнасці».
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.25, 20.45, 0.50** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.45, 16.50 «Лягавы». Серыял (16+).**
**20.15, 23.15** «СТБ спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**22.00** «P.S.»
**0.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).

### МІР

**5.00, 15.05, 16.20, 3.50** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**5.45, 10.10, 4.40 Серыял «Дзяржаўная мяжа» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 2.35** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00. 3.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.15** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.00, 22.00** «Назад у будучыню» (16+).
**22.55** «Сусветныя гульні розуму» (16+).
**23.25 Маст. фільм «Мініно» (16+).**
**1.20 Маст. фільм «Варатар».**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35, 14.45 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны—Беларусь.
**15.40** «Кропкі над і» (16+).
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Прыватнае жыццё» (12+).**
**23.10** «Лёс чалавека з Барысам Карчэўнікавым».
**0.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 07.10, 8.20, 16.20, 19.40, 21.55, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** «Здароўе» (12+).
**7.25** Маршрут пабудаваны (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** Зламаць стэрэатыпы (12+).
**8.55** «Навукаманія» (6+).
**9.30, 22.00** «НЗ.by».
**9.50, 10.25 Серыял «Ляснік» (16+).**
**12.05** Гісторыі выратавання (12+).
**12.35, 13.50, 16.30 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**17.55** «ДНК» (16+).
**19.55 Фільм «Маё прозвішча Шылаў» (16+).**
**22.20, 23.45 Дэтэктыў «Балабон-2» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 17.30, 21.10, 1.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад «Трансформеры прайм» (6+).
**7.30, 14.50, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Дзённік геймера» (12+).**
**8.20 Серыял «Светлячок» (12+).**
**9.05. 15.10, 17.35** «Хачу ў Парыж».
**9.10, 15.15 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**10.00 Серыял «Інданезія».**
**10.40 Прыгоды «Гары Потэр і філасофскі камень» (12+).**
**13.05 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**14.45** «Надвор'е».
**14.50** Мультпарад «Дом Савы».
**16.00 Серыял «Чорнае каханне» (16+).**
**17.50 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.30 Серыял «Самара» (16+).**
**19.55 Серыял «Экспрапрыятар» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» «Пчолка Мая» (0+).
**21.15 Драма «Пяніна» (16+).**
**23.10 Меладрама «Дзевяць з паловай тыдняў» (18+).**

# субота, 18 верасня

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

### ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Раніца з гумарам». Дайджэст (16+).
**9.00** М/ф «Лекс і Плу» (6+).
**9.25** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.50** М/ф «Царэўна» (6+).
**10.20** Анімацыйны фільм «Рэтчат і Кланк: галактычныя рэйнджары» (6+).
**12.10** Серыял «Анжаліка» (16+).
**14.45, 22.50, 2.20** «Уральскія пельмені» (16+).
**15.50, 18.25** Серыял «Іванова-Іванова» (16+).
**21.00** «Форт Баярд» (16+).
**0.15** Камедыя «Дзядуля лёгкіх паводзінаў» (18+).



**4.00** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**5.35** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30** «Біблейскі сюжэт».
**7.05** «Каштанка». «Ноч перад Калядамі». М/ф.
**8.25** «Добры дзень, доктар!» Мастацкі фільм [СЦ].
**9.45** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.15** «Міміно». Мастацкі фільм [СЦ].
**11.50** «Эрмітаж» [СЦ].
**12.20** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**13.00** Зямля людзей. «Усходнія ханты. Прапіска ў лесе» [СЦ].
**13.30** «Эйнштэйны ад прыроды». Дакументальны серыял [СЦ].
**14.25** Штучны адбор.
**15.05** «Мікіта Далгушын. Казка яго жыцця». Дакументальны фільм.
**15.30** Вялікія і маленькія.
**17.40** «Забытае рамяство». Дакументальны серыял.
**17.55** Да 90-годдзя з дня нараджэння Руфіны Ніфонтавай. «Яна была непрадказальная...» Дакументальны фільм [СЦ].
**18.35** «Вялікія міфы. Адысея». Дакументальны серыял.
**19.05** «Абуджэнне». Мастацкі фільм.
**21.05** «Разведка ў асобах. Нелегалы». Дакументальны фільм [СЦ].
**22.00** «Агора».
**23.00** «Апантаны Аляксандр Дзюма». Дакументальны фільм.
**23.55** «Кінескоп».
**0.35** «Жыгала і Жыгалета». Мастацкі фільм.
**1.20** «Эйнштэйны ад прыроды». Дакументальны серыял [СЦ].
**2.10** Шукальнікі. «Цёмная гісторыя белага каменя».

### Настальгія

**6.00** Фільм-спектакль «Вялікая магія» (16+).
**8.25, 9.40, 11.00, 15.40, 17.40, 2.20, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**11.20, 5.20** Дак. фільм «Цэхавікі. Небяспечная справа» (16+).
**12.00** «Да і пасля...» (16+).
**13.10** Маст. фільм «Дзве сястры» (16+).
**14.15, 20.15** «Мы спяваем вершы...» (12+)
**16.00** «Колба часу» (12+).
**17.00, 23.20** «Блеф-клуб» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Багатая нявеста» (16+).
**19.30** «Па той бок рампы» (12+).
**21.00** «Быў час» (16+).
**22.00** Маст. фільм «Я свабодны, я нічый» (18+).
**0.00** Фільм-канцэрт «Чырвона-Белае мора капітана Кіма» (12+).
**0.55** «Аншлаг! Аншлаг!» (12+)

### EuroSport 1

**0.00** Конны спорт. Турнір Вялікага шлема (12+).
**1.00, 4.00, 9.35,** Веласпорт. Тур Люксембурга. Мужчыны (16+).
**2.30, 6.30, 14.00, 15.45** Мотагонкі на цягавітасць. «24 гадзіны Ле-Мана» (16+).
**5.30, 11.00** Веласпорт. Тур Славакіі. Мужчыны (16+).
**9.30, 12.00, 12.30** Тэлечасопіс The Minute (16+).
**12.35** Веласпорт. ЧМ. Мужчыны (16+).
**15.15** Матасайклінг (16+).

### Кінакамедыя

**1.00** «На мора!» (16+)
**2.45** «Сябар нявесты» (16+).
**4.25** «Вялікі тата» (12+).
**6.00** «Кадры» (12+).
**8.15** «Майкл» (16+).



**10.10** «Што магло быць горш?» (12+)
**12.05** «Удачлівы выпадак» (16+).
**13.50** «Мой хлопец — кілер» (18+).
**15.35** «Модная штучка» (12+).
**17.35** «Мой хлопец з заапарку» (12+).
**19.30** «Самы лепшы дзень» (16+).
**21.25** «Як адмыць мільён» (12+).
**23.45** «Начное жыццё» (16+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.05** «Тум-Пабі-Дум» (0+).
**11.00** «Улегцы» (12+).
**11.35** «М & S» (12+).
**12.15, 5.30** «Паглядзім» (12+).
**12.55** «Чарнобыль. Зона адчужэння» (16+).
**15.50** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**19.35** «Гэта рэальная гісторыя» (16+).
**20.40** «Асцярожна, ашуканцы!» (16+)
**21.15** «Світанне на Сантарыні» (12+).
**23.15** «Перыскоп» (16+).
**23.35** «Пярэварацень» (16+).
**1.40** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

### ТБ1000

**5.00** Акадэмія вампіраў (16+).
**6.40** Дракула (16+).
**8.15** Інтэрв'ю з вампірам (16+).
**10.30** Таксі (16+).



**12.10** Таксі-2 (12+).
**13.45, 0.55** Таксі-3 (16+).
**15.20, 2.10** Таксі-4 (12+).
**17.00** Ранга (6+).
**19.00** Адчайны (16+).
**20.55** Аднойчы ў Мексіцы (16+).
**22.40** Цягнік на Юму (16+).
**3.35** Маленькі Манхэтэн (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Бык (16+).
**7.05** Сёстры (16+).
**8.35** Стылягі (16+).
**11.00** Мяжа. Таежны раман (16+).
**13.25** Васьмёркі (16+).
**15.00** Блокбастар (16+).
**16.30** Мажор (16+).
**18.15** Як я стаў рускім (16+).
**20.05** Пара з будучыні (12+).
**21.55** Давай развядзёмся! (12+)



**23.40** Змешаныя пачуцці (16+).
**1.15** Прайгранае месца (16+).
**2.45** Рубеж (12+).
**4.15** Мне не балюча (16+).

### National Geographic

**6.00, 6.20, 6.45** Навуковыя глупствы (16+).
**7.10, 7.35** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**8.00** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**8.55, 9.45** Аўта-SOS (16+).
**10.40, 11.35, 12.30, 13.20, 14.10, 15.05** Марс (16+).
**16.00, 16.45, 17.40** Непакорлівы вострай (16+).
**18.25, 19.15** Экстрэмальнае падарожжа (16+).
**20.05, 21.00** Апошняя крокі Гітлера (16+).
**21.50, 22.40** Па іх уласных словах (16+).
**23.30, 0.25** Асушыць акіян (16+).
**1.15, 2.05** Інстынкт выжывання (16+).
**2.50, 3.40** Антарктыка (16+).
**4.25, 5.15** Цяжкае золата Аляскі (16+).

### Discovery

**8.00, 8.25, 8.50, 9.20, 9.45, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**10.15, 0.00, 0.50, 1.45, 02.45, 03.40** Махінатары (12+).
**11.10** Невядомая экспедыцыя (12+).
**12.05** Геній аўтадызайну (12+).
**13.00** Сталёвыя хлопцы (12+).
**13.55, 14.20** Білі скупляе Бруклін (12+).
**14.50** Металаломшчыкі (12+).
**15.45, 16.10, 16.40, 17.05, 17.35, 18.00, 18.30, 18.55, 19.25, 19.50** Каралі аўкцыёнаў (12+).
**20.20** Касмічныя забойцы (16+).
**21.15, 22.10** Залатая ліхаманка (16+).
**23.05, 5.14** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**4.27** Бітва самагоншчыкаў (18+).
**6.01** Несакрэтныя матэрыялы (16+).
**6.48** Скаваныя (16+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

## серада, 15 верасня — ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 18.15, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**8.05** Зразумелая палітыка.
**9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).**
**10.55** «Скажынемаўчы».
**11.50, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Заві мяне мамай» (16+).**
**13.55** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.40, 15.25 Драма «Бумеранг» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Рубеж» (12+).
**0.00** Сфера інтарэсаў.
**0.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
**9.00, 16.55** Тэлебарометр.
**9.05, 20.10** Серыял «Сляпая» (16+).
**10.10, 22.45** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.15, 18.15 Серыял «Сінічка» (16+).**
**13.15** «На тыдзень» (16+).
**14.05** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.45** «Арол і рэшка. Перазагрузка-3» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 «Клон». Серыял (16+).**
**17.50** «Каралі палат» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.25** «Сакрэтны мільянер» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Бульбяны суп з салёнай рыбай.
**8.05, 12.00, 19.40, 23.40** Навіны культуры.
**8.25, 17.00 «Вечны кліч». Серыял (12+) [СЦ].**
**10.55** «Кадры жыцця». Оперная спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Людміла Колас.
**11.50** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**12.20** «Беларуская кухня». Зуцы.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05** «Легенды кіно». Леанід Філатаў (12+) [СЦ].
**13.55, 21.40 «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку». Мастацкі фільм (12+) [СЦ].**
**15.30** Харавое свята «Спявай, мая сталіца!»
**16.10** «Майстры і куміры». Народная артыстка Беларусі Бэла Масумян.
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).

### Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15, 13.55, 16.50, 21.30** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**9.20, 23.35** Міні-футбол. Чэмпіянат свету.
**11.15** Плаванне. Ліга ISL.
**13.25** Спорт-кадр.
**16.05** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі.
**18.50** Між іншым.
**19.10** Слэм-данк.
**19.40** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь) — «Кіль» (Германія).
**21.20** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.10** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.30 Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**19.00** «Аб'ектыўНа» (16+).
**20.00** Час.
**21.25 Серыял «Спытайце медсястру» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.25, 20.45, 0.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.45, 16.50 «Баец». Серыял (16+).**
**20.15, 23.15** «СТБ спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Мінчшына».

### МІР

**5.00, 10.10 Серыял «Дзяржаўная мяжа» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 2.50** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00, 3.35** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.15** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.00** «Назад у будучыню» (16+).
**22.55** «Сусветныя гульні розуму» (16+).
**23.25 Маст. фільм «Гары, гары, мая зорка» (16+).**
**1.15 Маст. фільм «Вясёлыя рабяты».**
**4.20 Серыял «Фантом» (16+).**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35, 14.45 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны—Беларусь.
**15.40** «Кропкі над і» (16+).
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40** «P.S.»
**21.10** Серыял «Прыватнае жыццё» (12+).
**23.10** «Лёс чалавека з Барысам Карчэўнікавым».
**0.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.10, 8.20, 16.20, 19.40, 22.05, 23.40** Сёння. Галоўнае.
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** «Здароўе» (12+).
**7.25** Маршрут пабудаваны (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**8.55** «Навукаманія» (6+).
**9.30, 22.10** «НЗ.by».
**9.50, 10.25 Серыял «Ляснік» (16+).**
**12.05** Гісторыі выратавання (12+).
**12.35, 13.50, 16.30 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**17.55** «ДНК» (16+).
**19.55 Серыял «Шэф. Вяртанне» (16+).**
**22.30, 23.55 Дэтэктыў «Балабон-2» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 17.30, 21.05, 0.55** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.30, 14.30, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Дзённік геймера» (12+).**
**8.20 Серыял «Светлячок» (12+).**
**9.05, 15.10, 17.35** «Хачу ў Парыж».
**9.10, 15.15 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**9.55 Серыял «Бразілія».**
**10.55 Драма «Пяніна» (18+).**
**12.50 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**14.35** Мультпарад «Дом Совы» (0+).
**16.00 Серыял «Чорнае каханне» (16+).**
**17.40 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.45 Серыял «Хатні арышт» (16+).**
**19.55 Серыял «Экспрапрыятар» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» «Пчолка Мая» (0+).
**21.10 Меладрама «Серэна» (16+).**
**23.00 Драма «Веру ў каханне» (12+).**

## пятніца, 17 верасня — ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

### ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00, 14.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**10.10** «Дурні і дарогі» (16+).
**10.50** Камедыя «Эйс Вентура-2: калі кліча прырода» (12+).
**12.40** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**13.10** «Наш рамонт» (16+).
**16.00** «Галілея» (12+).
**17.00, 18.35** «Форт Баярд» (16+).
**20.10, 21.40, 23.10, 0.40** Серыял «Гранд» (16+).
**2.05** Жахі «Праклён Хопвел» (16+).
**3.45** «Уральскія пельмені» (16+).
**5.00** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Дамы ў сярэбраных танах.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** «Ігнат Сцялецкі. Таямніца падземных палат». Дакументальны фільм [СЦ].
**8.15** «Забытае рамяство». Дакументальны серыял.
**8.35** Колер часу. Іван Мартас.
**8.45** Легенды сусветнага кіно. Леанід Быкаў.
**9.15** «Сімфанічны раман». Серыял [СЦ].
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Каханая дзяўчына». Мастацкі фільм.
**12.00** Раман у камені. «Уладзікаўказ. Дом для Сонечкі». Дакументальны фільм.
**12.25** «Шахеразада». Серыял.
**13.30** Улада факта. «Гісторыя і геапалітыка».
**14.15** «Мераб Мамардашвілі. Філасофскі востраў». Дакументальны фільм [СЦ].
**15.05** Лісты з правінцыі. Горад Льгоў (Курская вобласць) [СЦ].
**15.35** «Энігма. Пётр Бечала».
**16.15** «Добры дзень, доктар!» Мастацкі фільм [СЦ].
**17.40** Гістарычныя канцэрты. 100-годдзе Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі.
**18.45** «Царская ложа».
**19.45** «Смехаанастальгія».
**20.15** Лінія жыцця. Роберт Ляпідзеўскі [СЦ].
**21.10** «Мімiно». Мастацкі фільм СЦ].
**22.45** «2 Вернік 2».
**0.00** Асаблівы погляд з Сэмам Клябанавым. «Стыкс». Мастацкі фільм.
**1.45** Шукальнікі. «Паражэнне Івана Грознага».
**2.30** «Гісторыя аднаго горада». «Вялікая бітва Слана з Кітом». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** Фільм-канцэрт «Чырвона-Белае мора капітана Кіма» (12+).
**6.55** «Аншлаг! Аншлаг!» (12+)
**8.20, 9.40, 11.00, 14.25, 15.40, 17.00, 21.40, 23.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.20, 17.20** Дак. фільм «Цэхавікі. Небяспечная справа» (16+).
**12.00** Фільм-спектакль «Вялікая магія» (16+).
**18.00** «Да і пасля...» (16+).
**19.10** Маст. фільм «Дзве сястры» (16+).
**20.15** «Мы спяваем вершы...» (12+).
**22.00** «Колба часу». Прамы эфір (12+).
**23.00** «Блеф-клуб» (16+).
**0.00** «Быў час» (16+).
**1.25** «Рок-н-рол ТБ» (16+).
**2.05** Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс»(12+).

### EuroSport 1

**0.00, 12.00, 19.30** Тэлечасопіс (16+).
**1.00, 4.00, 9.30, 14.30, 15.30, 20.00** Веласпорт. Тур Люксембурга. Мужчыны (16+).
**2.30** Матасайклінг (16+).
**5.30, 11.00, 13.30, 17.30, 21.30** Веласпорт. Тур Славакіі. Мужчыны (16+).
**6.30** Матагонкі на цягавітасць. «24 гадзіны Ле-Мана» (16+).
**12.30** Веласпорт. ЧМ. Мужчыны (16+).
**18.30, 22.30** Веласпорт. Чэмпіянат Фландрыі. Мужчыны (16+).
**23.30** Ралі. ERC. Азорскія астравы (16+).

### Кінакамедыя

**1.45** «Вялікі тата» (12+).
**3.25** «Майкл» (16+).
**5.15** «Робін Гуд: мужчыны ў трыко (12+).
**7.10** «Нічога не бачу, нічога не чую» (16+).
**9.05** «Самы лепшы дзень» (16+).
**11.05** «Маска Зора» (12+).
**13.35** «Легенда Зора» (6+).
**16.00** «Ружовая Пантэра-2» (12+).
**17.40** «Мой хлопец — кілер» (18+).



**19.30** «Ягуар» (16+).
**21.20** «Неверагодны Берт Уандэрстоўн» (12+).
**23.10** «Удачлівы выпадак» (16+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.00** «Паглядзім» (12+).
**9.35** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
**11.25** «Урачы» (16+).
**12.30, 18.05, 2.15** «Сляпая» (16+).
**13.35** «Варажбітка» (16+).
**14.15** «Старац» (16+).
**14.55** «Суд ідзе» (16+).
**16.00** «Якія вярнуліся» (16+).
**17.00** «Нечысць» (16+).
**19.40** «Звышнатуральны адбор» (16+).
**20.45** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**21.50** «Жахі» (12+).
**23.50** «Астрал: глава 2» (16+).
**1.45** «Хопіць чутак» (16+).
**3.40** «Паралельны свет» (12+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

### TV1000 ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Доктар Хаус (16+).
**6.55, 3.25** Васабі (16+).
**8.40** Давайце патанцуем (12+).
**10.45** Тры метры над узроўнем неба (16+).
**13.00** Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу (16+).
**15.25** Спяшайся кахаць (12+).



**19.00** Інтэрв'ю з вампірам (16+).
**21.15** Акадэмія вампіраў (16+).
**23.05** Дракула (16+).
**0.40** Таксі (16+).
**2.05** Таксі-2 (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.40, 3.00** Мяжа. Таежны раман (16+).
**8.00** Кіроўца для Веры (16+).
**10.05** Сэлфі (16+).
**12.10** Духless-2 (16+).
**14.10** Мажор (16+).
**15.55, 16.55, 17.55, 18.55** Чырвоная каралева (16+).
**19.55** Блокбастар (16+).
**21.25** Васьмёркі (16+).
**23.00** Тэкст (18+).
**1.15** Мне не балюча (16+).

### National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.30** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**7.15** Незвычайныя промыслы (16+).
**8.05** Востраў бунтароў (16+).
**8.55, 9.50** Аўта-SOS (16+).
**10.40, 11.35** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**12.25, 16.45** Аляска: новае пакаленне (16+).
**13.15, 14.10** Асушыць акіян (16+).
**15.05** Ліхтугі за мяжой (16+).
**15.55** Наркавойны (16+).
**17.35** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**18.25, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**19.15, 20.05** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 2.35** Эфект з Галь Гадот (16+).
**22.30** Настольная кніга дыктатара (16+).
**23.25** Даследчык 2.0 (16+).
**0.10, 1.00** Мяжа (16+).
**1.50** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**3.50** Ледзяная дарога (16+).
**4.35** Інстынкт выжывання (16+).
**5.20, 5.35** Гульні розуму (16+).

### Discovery

**8.00, 10.15, 10.40, 21.15, 21.40, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Каралі аўкцыёнаў (12+).
**12.05, 13.00** Залатая ліхаманка (16+).
**13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10** Бітвы за кантэйнеры (16+).
**17.35** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (12+).
**23.05, 05.14** Смяротны ўлоў (16+).
**0.00, 6.01** Аляска: апошні рубеж (16+).
**0.55, 6.48** Аўтабан А8 (12+).
**1.50, 02.45, 03.40** Ратавальнікі-цяжкавагавікі (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

# «ВОДНАЕ» МАХЛЯРСТВА: ФІЛЬТР ЗАМЕСТ 90 ПА 250 РУБЛЁЎ

**Гэтая актуальная тэма была ў полі зроку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы Таццяны РУНЕЦ, якая наведала Баранавічы і Баранавіцкі раён на мінулым тыдні.**

Першую частку рабочай паездкі сенатар прысвяціла рабоце са зваротамі грамадзян. Нагодай для нарады стала скарга чатырох грамадзян Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці на дзеянні прадпрымальніка, які зарэгістраваны ў Баранавічах. Вясковым жыхарам прадпрымальнік прадаў фільтры для вады. Як яны палічылі, па завышанай цане. Так сталася, што з дапамогай пракуратуры Брэсцкай вобласці адной грамадзянцы пазней вярнулі грошы. Другія звярнуліся з аналагічнай скаргай у Савет Рэспублікі і Баранавіцкі гарвыканкам.

## Нагода для праверкі

Таццяна Рунец ініцыіравала нараду ў гарвыканкаме, каб абмеркаваць не толькі асобна ўзятыя звароты, але і пагаварыць аб праблеме ў цэлым, вызначыць шляхі яе вырашэння. У нарадзе прымалі ўдзел **старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Юрый ГРАМАКОЎСКІ, Баранавіцкі міжраённы пракурор Аляксандр КАРЛЮК,** адказныя работнікі гарадской і раённай вертыкалі.

**Начальнік аддзела гандлю і паслуг Таццяна АСОС** патлумачыла, што ва ўсіх выпадках індывідуальны прадпрымальнік прадстаўляе дагаворы, якія падпісалі грамадзяне. Ён мае сертыфікат, які пацвярджае якасць тавару. У яго ёсць калькуляцыя, як з закупачнай цаны прыкладна ў 90 рублёў становіцца выніковая цана для кліентаў 250 рублёў. Па першым патрабаванні ён прадстаўляе ўсю неабходную інфармацыю.

Але ў гарвыканкама з'явілася інфармацыя, што супрацоўнікі гэтага ІП рэкамендаваліся сельскім жыхарам, напрыклад, работнікамі ЖКГ, водаканала. Ён, вядома, адмаўляе апошняе. Але ж зразумела, што супрацоўнікі, зарплата якіх залежыць ад колькасці продажаў, маглі праявіць «ініцыятыву», адзначалі на нарадзе.

Пракурор Аляксандр Карлюк заўважыў, што такія сігналы могуць быць нагодай для праверкі ўчастковым інспектарам дакументаў візіцёраў з усімі наступствамі. «Яшчэ мы можам правесці экспертызу, — патлумачыў Аляксандр Паўлавіч. — Калі фільтр не адпавядае параметрам, вобразна кажучы, калі замест яго стаіць паралон, гэта ўжо састаў злачынства. Міліцыя праверыць работу ІП на прадмет наяўнасці правапарушэння».

## Маштабная прафілактыка

Старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Юрый Грамакоўскі падкрэсліў, што на першы план у дадзенай праблеме выходзіць прафілактыка, асновы якой складае шырокая тлумачальная работа: «У вёсцы гэта сельвыканкамы, старасты, у горадзе — старшы па пад'ездзе, які праінфармуе ўчастковага, а той у сваю чаргу прыме меры. Для прафілактычнай работы мы ў сябе прыцягваем водаканал, ЖЭС. Папераджальную інфармацыю для жыхароў пішам, напрыклад у жыроўках на зваротным баку».

Тэму падтрымаў **старшыня Баранавіцкага райсавета Сяргей СЛІВА:**

— Праблема ёсць, у нас на першым плане прафілактычнай работы — старшыня сельскага Савета, за ім — старасты вёскі. Аглядная камісія, калі едзе па дамах, праводзіць гутарку, людзей заклікаюць быць пільнымі. Былі выпадкі, калі вяскоўцам прапанавалі супрацьпажарныя апавяшчальнікі і прадставіліся супрацоўнікамі МНС. Таму гаворым пра гэта на сельскіх сходах, нават на свяце вёскі не забываем аб прафілактычнай рабоце. Бо на святкаваннях бываюць дзеці сельскіх жыхароў, а яны лішні раз потым нагадаюць пажылым бацькам пра пільнасць.

Цікава, што пакуль ішла нарада, на гаджэт **начальніку аддзела па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб гарвыканкама Святланы БАРЗЯНКОВАЙ** прыйшла інфармацыя, што тром астатнім заяўнікам прадпрымальнік вярнуў грошы.

Таццяна Рунец адзначыла станоўчы вопыт Баранавічаў і Баранавіцкага раёна па прафілактыцы махлярства ў дачыненні да пажылых грамадзян: «Мы ў Савеце Рэспублікі абагулім ваш вопыт прафілактыкі, давядзём інфармацыю да іншых рэгіёнаў», — сказала сенатар.

## Замарожаная будоўля

Другая палова нарады прысвячалася яшчэ аднаму няпростаму звароту. У Савет Рэспублікі звярнуўся прадпрымальнік, які не можа ўзвесці гандлёвы аб'ект з 2012 года. Грамадзянін зрабіў праект, атрымаў дазвол на будоўлю, але ў працэсе адступіў ад першапачатковага праекта і вырашыў павялічыць плошчу аб'екта. І ўсё гэта можна вырашыць ва ўстаноўленым законам парадку, але супраць выступіла гаспадыня дома, што знаходзіцца па суседстве з будоўляй. І так усё закруцілася, што паўстала пытанне пра знос таго, што ўжо ўзведзена. Гарвыканкам прапануе бізнесмену вярнуцца да праекта 2017 года, але ён не пагаджаецца. Кожны з бакоў прыводзіць свае аргументы, абапіраючыся на закон, і кожны ў пэўнай ступені мае рацыю.

Азнаёміўшыся з дакументамі і выслухаўшы бакі, Таццяна Рунец раіць шукаць кампрамісны варыянт, прымаць гібрыд з двух праектаў — інакш справа і далей не зрушыцца з месца.

## На прадпрыемстве, што ўстойліва развіваецца

У другой палове дня сенатар наведала птушкафабрыку «Дружба». Тут яна пабывала ў бройлерным цэху «Белыя лугі», дзе азнаёмілася з ходам рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па прыцягненні ў гаспадарчы зварот пляцоўкі свінакомплексу «Усходні» пад вырошчванне птушкі. Аб'ект знаходзіцца каля вёскі Цяпліва. Экскурсію правёў калега Таццяны Рунец, **член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Васіль МАРКЕВІЧ.**

Адкрытае акцыянернае таварыства — сёння найбуйнейшая і адна з найбольш паспяховых гаспадарак Баранавіцкага раёна. На тэрыторыі яна назіраецца да некаторых невялікіх раёнаў краіны. Прадпрыемства ўвесь час развіваецца. Новая пляцоўка з 53 памяшканнямі была перададзеная на баланс фабрыкі ў 2018 годзе. Рэканструкцыя вядзецца паэтапна, таму паралельна ідуць работы на адным аб'екце, а на другім ужо гадуюць птушку. На прадпрыемстве плануюць нарошчваць аб'ёмы прадукцыі, пастаўляць яе як на свой рынак, так і на экспарт.

Першапачаткова была запланаваная сустрэча з працоўным калектывам у актавай зале птушкафабрыкі. Але ў ходзе работы Таццяна Рунец памяняла фармат сустрэчы, улічыўшы, што калектыў птушкафабрыкі пераважна складаецца з жанчын. Сенатар пагаварыла з працаўніцамі паасобку на іх рабочых месцах. Размова вялася аб умовах працы і сацпакет, які гарантуе прадпрыемства, аб прафесійных захворваннях і сістэме страхавых выплат у выпадку хваробы, аб клопатах, звязаных з сям'ёй і побытам. Такім чынам, размова атрымалася больш прадметнай, адкрытай і шчырай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ



# Аграрыям падставяць плячо

**На пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў сфакусіраваліся на тэме падтрымкі працаўнікоў аграпрамысловага комплексу. Гаварылі пра набыццё камбайнаў, гаруча-змазачных матэрыялаў і пра іншае, што неабходна для развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці.**

У прыватнасці, напрыканцы жніўня былі ўручаны ключы ад васьмі кормаўборачных камбайнаў айчыннай вытворчасці. Цырымонію перадачы тэхнікі арганізавалі на плошчах віцебскага ААТ «Заходне-Дзвінскі МРС». Такія кормаўборачныя камбайны FS80 ад «Гомсельмаша» эфектыўна выкарыстоўваюцца ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах з сярэднімі і буйнымі аб'ёмамі корманарыхтоўкі. Канструктарскія рашэнні, надзейны і эканамічны рухавік, камплектуючыя высокага тэхнічнага ўзроўню — усё разлічана на стабільную работу камбайна ў самых складаных умовах з высокай якасцю драбнення. Што вельмі важна: у кабіне ўтульна і зручна. Канструктары паклапаціліся, каб быў выдатны панарамны агляд усёй працоўнай зоны пры рабоце з любым з адаптараў. Прадумана надзейная ахова ад спякоты, вібрацыі, шуму і пылу. Крэсла механізатара і рулявая калонка, дзякуючы сістэме рэгулявання, ідэальна прыстасоўваюцца пад чалавека любога росту і камплекцыі.

У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта падлічылі, што для нармальнай дзейнасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Віцебшчыны неабходна кожны год абнаўляць да дзесяці працэнтаў машынна-трактарнага парка. А ўсяго ў Падзвінні прыблізна трыццаць тысяч машын сельскагаспадарчага прызначэння. Сярод іх каля 1,3 тысячы зернеўборачных камбайнаў, прыблізна палова тысячы кормаўборачных.

Новая тэхніка — гарантыя таго, што аграрыі будуць прытрымлівацца тэхналагічных патрабаванняў і павышаць эфектыўнасць працы.

Трэба сказаць, што ў вобласці функцыянуе каля 230 сельскагаспадарчых арганізацый.

На слыху і тое, што на поўначы краіны першымі пачалі рэгістраваць і развіваць буйныя спецыялізаваныя комплексы. Зараз іх сем. Яны створаны на базе ААТ «Віцебскі мясакамбінат», «Аршанскі мясакансервавы камбінат», «Пастаўскі малочны завод», «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат», «Полацкі малочны камбінат», «Малако» (г. Віцебск), і «Верхнядзвінскі масласырзавод».

На розных узроўнях улады многае робіцца для пад'ёму на новы вытворчы ўзровень аграпрамысловага комплексу. Мясцовая ўлада, кіраўнікі гаспадарак, радавыя работнікі высока ацанілі тое, што на ўзроўні кіраўніцтва краіны




аказана падтрымка дзеля перазагрузкі сельскагаспадарчай галіны. Маецца на ўвазе Указ Прэзідэнта № 70 «Аб развіцці аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці». У ім прапісана, як павышаць эфектыўнасць кіравання аграпрамысловым комплексам, умацоўваць кадравы патэнцыял арганізацый, удасканальваць механізмы кіравання актывамі, гаворацца аб прэферэнцыі і гэтак далей.

Сёлета тэмпературныя рэкорды ўнеслі карэктывы ў дзейнасць аграрыяў. Упершыню ўжо ў сярэдзіне лета прыйшлося займацца масавай уборкай крыжакветных і збожжавых. Але нашы кармільцы не падвялі і папрацавалі вельмі добра.

Нагадаем, што абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2021» пройдзе ў гарадскім пасёлку Шуміліна 18—19 верасня.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

## Спрыяць развіццю рэгіёна

**Сенатар наведаў дзяржаўнае прадпрыемства «Мазырскія малочныя прадукты» і сустрэўся з працоўным калектывам.**

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Алег СЛІНЬКО** днямі пабываў на прадпрыемстве, якое прадстаўлена на рынку малочных прадуктаў больш за 75 гадоў. У аснове вытворчай стратэгіі тры складнікі: натуральная сыравіна, поўнае тэхнічнае пераснашчэнне і ўкараненне міжнародных стандартаў якасці. Тут праводзіцца пастаянная работа па дыверсіфікацыі экспарту і пашырэння геаграфіі паставак. За суткі завод перапрацоўвае больш за 300 тон малака, у асартыменце — больш за 80 відаў прадукцыі, якая карыстаецца вялікім попытам і заслужыла прызнанне спажыўцоў.

Парламентарый азнаёміўся з работай прадпрыемства, падзяліўся ўражаннем ад Вялікай размовы з Прэзідэнтам і сваім меркаваннем аб сітуацыі, што складваецца вакол краіны, а таксама адказаў на пытанні, якія цікавілі работнікаў прадпрыемства.

— Задача кожнага з нас — сваёй працай, інавацыйнымі ідэямі, думкамі — спрыяць развіццю свайго рэгіёна і краіны ў цэлым, — адзначыў сенатар.

## Заўсёды на сувязі

**Аляксей КУШНАРЭНКА правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.**

Да члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы звярнуліся падчас прыёму чатыры заяўнікі па пытаннях, якія датычацца газіфікацыі, тэхнічнага абслугоўвання газавага абсталявання і абследавання газаправодаў. Таксама паступіла просьба аб аказанні садзейнічання пры выкананні работ па рэканструкцыі сістэмы газазабеспячэння жылога дома.

**Анатоль ШАЛТАНЮК:**

## «У Следчым камітэце працуюць людзі, адданыя закону і якія стаяць на варце праўды і справядлівасці»

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня раённага Савета дэпутатаў прыняў удзел ва ўрачыстым адкрыцці новага будынка Жабінкаўскага раённага аддзела Следчага камітэта.**

— Сёння Следчы камітэт — адзін з удзельнікаў праваахоўнай сістэмы краіны, у кампетэнцыі якога знаходзіцца расследаванне найбольш складаных злачынстваў. Важна, каб людзі, адданыя закону і якія стаяць на варце праўды і справядлівасці, працавалі ў камфортных умовах, — падкрэсліў сенатар.

Ён павіншаваў усіх супрацоўнікаў з наваселлем і пажадаў эфектыўнага вырашэння службовых задач, моцнага здароўя, дабрабыту і далейшых поспехаў у служэнні Айчыне.

На цырымоніі адкрыцця прысутнічалі старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Гара, начальнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці Дзмітрый Канаплянік, прадстаўнікі пракуратуры і органаў унутраных спраў.

# ЧАМУ ГАРАДЖАНЕ ВЫБІРАЮЦЬ ВЁСКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 7–й стар.)

***— Перад візітам да вас зазірнула на сайт сельвыканкама і не ўбачыла там рэестра пустых дамоў. Усё раскуплена?***

— Так, і старыя дамы, і новыя ўчасткі, якія мы фарміруем для продажу з аўкцыёну, хутка раскупляюцца. У нас ёсць два пустыя дамы, але яны пакуль у добрым стане, і мы ведаем, што ёсць спадчыннікі не першай чаргі. Зараз адшукваем іх. Як правіла, нашчадкі хутка арыентуюцца, як распарадзіцца маёмасцю. Самы вялікі попыт у нас на купалаўскія мясціны — Вязынку, але і ў любой вёсцы з 31, якая знаходзіцца на тэрыторыі сельсавета, абавязкова жыве некалькі гараджан. Сярод іх ёсць спадчыннікі, якія рэканструявалі стары дом або пабудавалі новы. І шмат людзей, якія, як гаворыцца, выраслі на асфальце, але з узростам, прычым далёкім ад пенсіённага, пацягнуліся да зямлі. Яны хочуць мець большую жыццёвую прастору, чым дае гарадская кватэра ці нават садовае таварыства, дзе, па сутнасці, той жа чалавечы мурашнік.

***— Існуе тры варыянты, каб пасяліцца ў адным з самых прыгожых куткоў Беларусі: атрымаць спадчыну, купіць участак з аўкцыёну або на другасным рынку. Які з іх самы надзейны?***

— Лепш за ўсё набыць участак з аўкцыёну. Чаму? Часам бывае нават так, што чалавек ездзіць, выбірае месца, потым прыходзіць у сельвыканкам і просіць: прадайце мне вось той участак. Мы глядзім, ці можам там яго сфарміраваць, таму што ён павінен адпавядаць мінімальным сацыяльным стандартам: наяўнасць дарогі, вады, электрычнасці. І тольк і потым праводзіцца адкрыты аўкцыён, то-бок, на гэты ўчастак можа і пяць чалавек прэтэндаваць. Продаж з аўкцыёну, як кажуць рыэлтары, гарантуе чысціню здзелкі.

***— Якія праблемы даводзіцца пераадольваць пры набыцці дамоў у вёсцы на другасным рынку або пры атрыманні спадчыны?***

— Вылучыў бы дзве праблемы: праваўстанаўлівальныя дакументы і парушэнне межаў участкаў. Сустракаюцца сітуацыі, калі людзі жылі ў доме паўстагоддзя, але ніякіх дакументаў не афармілі. У прынцыпе, некалі так



Уладзімір ВАСІЛЬКОЎ, старшыня Радашковіцкага сельскага выканкама.

Фота з асабістага архіва.

і было: пабудаваў дом, запісаўся ў пагаспадарчай кнізе сельсавета, і на гэтым усё. Калі ж з'явіліся сучасныя патрабаванні да дакументавання жылля і зямлі, некаторыя людзі вырашылі, што іх гэта не датычыцца, бо даўно тут жывуць. І вось якраз такія моманты выяўляюцца пры ўступленні ў спадчыну альбо продажу дома на другасным рынку. Што мяне здзіўляе? Пакупнікі — законапаслухмяныя людзі, як правіла, з вышэйшай адукацыяй, а то і не з адной, але вось трапляюць у няёмкае становішча. Ім кажуць: «Будуйся, фармальнасці вырашым пасля». Чалавек заплаціў грошы і будуе новы дом або рэканструюе стары. Потым прадаецца суседні ўчастак, і высвятляецца, што межы парушаныя. Пачынаецца разгляд, і ўсплываюць іншыя нюансы. Была сітуацыя, калі чалавеку прыйшлося літаральна знесці частку новага дома, каб увайсці ў межы свайго ўчастка.

***— Як пазбегнуць такой сітуацыі?***

— Працую тут амаль два гады, і за гэты час быў толькі адзін званок: «Мы купілі дом, можа, трэба нейкія звесткі падаць». А лепш за ўсё, перш чым купіць дом, прыйсці ў сельвыканкам і ўдакладніць усе нюансы.

***— Ці ёсць магчымасць аднавіць дакументы на стары дом?***

— Вядома, для гэтага трэба звярнуцца ў агенства па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Там спецыялісты даюць літаральна пакрокавую інструкцыю — якія дакументы патрэбныя і дзе іх атрымаць. Зноў жа, усе дарогі вядуць да нас: падымаем пагаспадарчыя кнігі, архівы.

***— Што можна сказаць пра занятк і гараджан, якія пераехалі сюды?***

— Хтосьці выкарыстоўвае дом як лецішча, некаторыя жывуць пастаянна. Раніцай, калі еду на работу, заўважаю, што машыну з пяцёркай на нумарным знаку трэба яшчэ пашукаць, а вось «сямёркі» актыўна едуць у сталіцу. Некаторыя людзі тут адкрываюць свой бізнес. Многія могуць дыстанцыйна працаваць, і ўжо больш за год гэта вельмі актуальная тэма.

***— Як ідзе справа з рэгістрацыяй, бо ад гэтага залежыць кошт многіх паслуг?***

— У сельскіх дамах людзі могуць мець пастаянную або часовую рэгістрацыю. Апошні варыянт зручны для тых, хто жыве тут як дачнік.

***— Ці вызначаны стандартны памер участка, які людзі могуць набыць на аўкцыёне?***

— Для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома прадугледжаны ўчастак 15 сотак. Да гектара зямлі можна набыць для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, але прэтэндаваць на гэта могуць толькі тыя, хто пастаянна зарэгістраваны на тэрыторыі сельсавета. На такім участку можна займацца земляробствам або гадаваць сельскагаспадарчых жывёл, але нельга, напрыклад, пабудаваць лазню або СТА. Пры куплі старых дамоў, як правіла, захоўваецца і ўчастак, ён можа быць і 25 сотак.

***— Ці ладзяць гараджане з мясцовымі жыхарамі?***

— Канфліктаў на глебе «мы — мясцовыя, а вы — прыезджыя», на шчасце, не згадаю. Зараз прыязджаюць не нуварышы, якія будавалі трохпавярховыя асабнякі і не віталіся з суседзямі. Цяпер будуюць дамы без празмернасцяў, людзі ўжо не хочуць выкідваць грошы на вецер, ацяпляючы пустыя пакоі. З мясцовымі гараджане знаходзяць агульную мову. Усе разам падтрымліваюць парадак на зямлі. У вёсцы ж як? Сусед зрабіў прыгожую клумбу — ну дык і я прыдумаю нешта цікавае. На сёння ў нас няма вёскі, якую было б сорамна паказаць.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

У тэму

## ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ ЯК ГОСЦІ, А З'ЯЗДЖАЮЦЬ СЯБРАМІ

**Такім пунктам на карце аказалася вёска Валадзькі. Прыгожае месца, якому ўжо 427–ы год!**

Некалькі незвычайны для Беларусі ўзгорысты ландшафт. А калі на пагорках растуць дрэвы, здаецца, што вёска стаіць у асяроддзі гор. Тут суседнічаюць дамы аўтэнтычныя і новыя, што стварае вельмі цікавую атмасферу — такі мікс горада і вёскі. Усе ўчасткі дагледжаныя, многія гаспадары нават за плотам пасадзілі кветкі. Мабыць, у кожным другім доме жывуць мінчане. Маю ўвагу прыцягнуў цікавы плот на ўскраіне вёскі. Аказалася, што гэта аграсядзіба. Яшчэ ў 1988 годзе сям'я мінскіх лінгвістаў Святланы і Генадзя Падрэз купіла стары драўляны дом пад лецішча. Гадоў дзесяць таму сюды пераехаў жыць іх сын Алесь. Спачатку ён разам з жонкай Марынай рэканструяваў і добраўпарадкоўваў дом для сябе. У госці часта прыязджалі сябры, і было вырашана гаспадарчыя пабудовы ператварыць у жылыя пакоі з усімі гарадскімі выгодамі. Сябры і ў гэтым дапамагалі.

Калі ўсталяваўся бязвізавы парадак уезду замежных грамадзян у Беларусь, вырашылі паспрабаваць прымаць гасцей. Турыстаў заўсёды прыцягвае фраза «тут размаўляюць на вашай мове». А ў сям'і Падрэз тры сертыфікаваныя гіды-перакладчыкі: Святлана, Генадзь і Алесь.

«Пандэмія ўнесла свае карэктывы, у мінулым годзе ў нас адпачывалі суайчыннікі, і яны зусім па-новаму адкрылі для сябе сваю ж краіну, — кажа Алесь. — Для нас няма розніцы, хто адпачывае: беларусы ці замежнікі — галоўнае, што прыязджаюць як госці, а з'язджаюць сябрамі».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

Адказны за выпуск: **АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 9 верасня 2021 года.

Падводзім вынікі

# ПАРААЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ — ТУРНІР ПЕРАМОЖЦАЎ

## Спаборніцтвы, дзе ніхто не прайграе

**У Токіа скончылася чарговая яркая спартыўная гісторыя — завяршыліся XVI Параалімпійскія гульні. Пераадоленне ўсіх чалавечых магчымасцяў, барацьба з абставінамі і неверагодная сіла духу — вось што робіць гэты форум непаўторнай і незвычайна цікавай падзеяй. Традыцыйна ўдзел у гэтым прымаюць і беларусы.**

Едучы ў Токіа, беларуская каманда «брала» не колькасцю, а якасцю. Краіну прадстаўляла ўсяго 20 спартсменаў, якія выступалі ў шасці відах спорту. Дадому параалімпійцы прывезлі сем медалёў. Дарэчы, такую ж колькасць медалёў у Токіа сабралі і алімпійцы. Магія лічбаў ці банальная спартыўная няўдача? Але ці можна ў дачыненні да параалімпійцаў назваць гэта няўдачай? Так, на мінулых Параалімпіядах беларусы заваёўвалі больш медалёў. У Лондане і Рыа іх было па дзесяць. Аднак і колькасць беларускіх удзельнікаў на летніх Параалімпіядах паменшаецца ад цыкла да цыкла. Скажам, у 2012 годзе пад беларускім сцягам выступалі 35 атлетаў. Не трэба быць вялікім матэматыкам, каб разумець, што колькасць медалёў залежыць ад колькасці ўдзельнікаў. Напрыклад, у пераможцы медальнага заліку, кітайскай зборнай, — 207 медалёў. Кітай у Токіа прадстаўлялі 250 спартсменаў, якія выступалі ў 20 з 22 відах спорту.

Беларуская мэта на Токіа была канкрэтная і філасофская — «не горш, чым раней». На жаль, «не горш» не атрымалася. Беларусь у медальным заліку размясцілася на 27-й пазіцыі, што таксама не найлепшы вынік спартсменаў. «Карацей кажучы, мы разлічвалі на дзясятак медалёў, а атрымалася сем. Але ўсё роўна каманда ва ўмовах пандэміі і з улікам іншых аб'ектыўных прычын выступіла дастойна», — заўважыў **старшыня Нацыянальнага параалімпійскага камітэта Алег ШЭПЕЛЬ.**

### ТРЫУМФ У БАСЕЙНЕ

Сенсацыю традыцыйна стварыў плывец Ігар Бокій. З сямі беларускіх медалёў яму належаць пяць. І ўсе залатыя. Ігар з кожных стартаў вяртаецца ў статусе чэмпіёна. З Рыа ён прывёз шэсць узнагарод найвышэйшай пробы, з Лондана — пяць. Цяпер Ігар Бокій — 16-разовы параалімпійскі чэмпіён. Першы медаль Ігар заваяваў у першы дзень Гульняў. На дыстанцыі 100 метраў батэрфляем у класе S13 ён паказаў вынік у 53,80 секунды і не проста перамог, а ўстанавіў новы рэкорд Параалімпіяды ў гэтым відзе. На другі дзень зноў былі медаль і рэкорд — гэтым разам на 100 метрах на спіне. У 2016 годзе ён праплыў такую дыстанцыю за 56,68 секунды і ўстанавіў сусветны і параалімпійскі рэкорды. У Токіа «залатым і рэкордным» часам сталі лічбы 56,36 секунды. Трэцяя пераможная дыстанцыя была на 400 метраў вольным стылем, якую спартсмен пераадолеў за 3 хвіліны 58,18 секунды. Вольны стыль прынёс Ігару «золата» і на дыстанцыі 50 метраў. Тут выніковы час — 23,21 секунды. Юбілейнае пятае «золата» і новы сусветны рэкорд прынесла дыстанцыя на 200 метраў комплексным плаваннем. Пераможны час — 2 хвіліны 02,70 секунды. Міма п'едэстала Ігар праплыў толькі ў адным відзе праграмы — на 100 метрах брасам, дзе стаў пятым.

У Токіа Ігар выступаў толькі на шасці дыстанцыях, у адрозненне ад Рыа, дзе стартаваў сем разоў. На гэ-



Ігар БОКІЙ.

тых Параалімпійскіх гульнях была скарочана яго любімая дыстанцыя — 100 метраў вольным стылем. У чэрвені ў інтэрв'ю «Звяздзе» трэнер Генадзь Вішнякоў адзначаў: «Я так падазраю, не ўсім падабаецца, што Ігару ўдаецца заваёўваць столькі медалёў. Таму цяпер мы рыхтуем шэсць дыстанцый — пяць профільных і адну эксперыментальную — 100 метраў брасам».

Падчас урачыстай сустрэчы ў мінскім аэрапорце Ігар расказаў журналістам, што Параалімпіяда ў Токіа была цяжэйшая за Лондан і Рыа. І таму сваімі вынікамі, медалямі і рэкордамі ён задаволены. «Мы прыехалі ў Токіа за тыдзень да старту і праз два дні ў нас два чалавекі здалі тэсты на COVID, якія аказаліся станоўчымі. Мы ўжо падумалі, што могуць і ўсю каманду «закрыць». Прыйшлося кожны дзень здаваць ПЛР-тэсты, таму ўсё было досыць напружана. Тым не менш, калі заваяваў першы медаль, хваляванне спала, гэта збіла перадстартавы мандраж і потым усё



Каманда па плаванні.

пайшло лягчэй. Я ўспомніў, што гэта далёка не першыя мае старты, і ўсё ўвайшло ў звыклую каляіну», — падзяліўся чэмпіён.

Цяпер у планах Ігара Бокія — адпачынак пасля напружанага сезона, а пасля — трэніроўкі і далейшыя выступленні. У наступным годзе плывец плануе выступіць на чэмпіянаце свету і рыхтавацца да Параалімпійскіх гульняў 2024 году ў Парыжы. «А ў далейшым хачу працягнуць выступленне, сілы яшчэ ёсць, так што буду старацца на кожным турніры выступаць як мага лепш, імкнуцца дасягнуць свайго максімуму», — падзяліўся Ігар. Тым больш што 16 залатых медалёў з галоўных стартаў — далёка не мяжа. Майкл Фэлпс, з якім часта параўноваюць Ігара (хоць беларусу такое параўнанне не падабаецца), падчас сваёй кар'еры сабраў 23 залатыя алімпійскія медалі. А рэкардсмен Параалімпійскіх гульняў Трыша Зорн мае 55 залатых медалёў з васьмі Параалімпіяд. Ігару яшчэ ёсць да чаго імкнуцца.

Ёсць куды імкнуцца і маладому беларускаму плыўцу Ягору Шчалканаву. У Токіа ён стаў сярэбраным прызёрам на дыстанцыі 100 метраў на спіне з вынікам 1 хв. 75 сек. Гэты вынік прынёс Ягору і асабісты рэкорд. Напярэдадні Параалімпійскіх гульняў на чэмпіянаце Еўропы Ягор заваяваў два бронзавыя медалі. Тады ён шакіраваў трэнерскі штаб і кіраўніцтва, паказаўшы свае найлепшыя вынікі. Такога прагрэсу Ягор дасягнуў усяго за паўтара года. «Ён адзін з самых перспектыўных спартсменаў, наша будучыня. Спадзяюся, у Парыжы ён зможа змагацца за самыя высокія месцы. Пакуль рана казаць пра Токіа», — за два месяцы да Параалімпіяды разважаў Генадзь Вішнякоў. І гэта той самы выпадак, калі памылка трэнера аказалася шчаслівай.

Пра сябе Ягор заявіў яшчэ пяць гадоў таму. Тады 15-гадовы спартсмен на Сусветных юнацкіх гульнях IWAS (Сусветныя Юнацкія гульні Міжнароднай федэрацыі калясачнікаў і ампутантаў. — **«Зв.»**) заваяваў тры медалі. Цяпер на яго рахунку — «серабро» Параалімпійскіх гульняў. І наперадзе — неабмежаваныя магчымасці, каб плысці далей і дасягаць свайго максімальнага выніку.

### БЕЗ МЕДАЛЯ, АЛЕ З ПОСПЕХАМ

Інтарэс да параалімпійскіх спаборніцтваў у Токіа падаграваў і ўдзел чалавека, які, здаецца, можа ўсё. У басейне «Акватык-цэнтра» выступаў Аляксей Талай. Акрамя ўсіх дасягненняў параалімпійца, ён яшчэ і матывацыйны спікер, бізнесмен, грамадскі дзеяч, член Канстытуцыйнай камісіі. У красавіку 2021 года ён аднавіў сусветны рэкорд на дыстанцыі 50 метраў брасам. А на чэмпіянаце Еўропы стаў бронзавым прызёрам на гэтай жа дыстанцыі. У Токіа Аляксей застаўся без медалёў. І падрыхтоўка спартсмена тут ні пры чым. Папершае, на Параалімпіядзе Аляксей выступаў не ў сваім самым цяжкім класе S1 (спартсмены з максімальнымі пашкоджаннямі здароўя), а ў класе S2, то-бок яго сапернікі мелі фізічную перавагу і іх функцыянальныя магчымасці былі большыя. А па-другое, алімпійскі від праграмы Аляксея — плаванне на спіне. А яму больш падыходзіць плаванне на грудзях, з яго канечнасцю лепш плысці брасам. Але ў брасе не знайшлося спартсменаў, здольных выканаць алімпійскі нарматыў для адбору ў Токіа.

На Параалімпіядзе каронная дыстанцыя прынесла спартсмену поспех. У папярэдніх заплывах на 50 метраў на спіне Аляксей паказаў вынік у 1 хвіліну 24,86 секунды. Гэта новы рэкорд Параалімпійскіх гульняў, які трымаўся з 1992 года і лічыўся амаль што вечным. У фінальным заплыве Аляксей на дасягнутым не спыніўся і ўдасканаліў уласны вынік. Цяпер ён праплыў дыстанцыю за 1 хвіліну 23,16 секунды. На жаль, гэтага часу не хапіла для п'едэстала, у выніковым пратаколе беларус размясціўся на 7-й пазіцыі. Але двойчы перапісаць 29-гадовы рэкорд Гульняў — таксама вялікае дасягненне і ўклад у параалімпійскую гісторыю. Менавіта выступленне ў іншым класе не пусціла рэкардсмена на п'едэстал.

### ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

Прыемна парадавала на Параалімпійскіх стартах і 19-гадовая Лізавета Пятрэнка. Спартсменка выступае ў класе F13 (парушэнні зроку). У кіданні кап'я яна заваявала бронзавы медаль, закінуўшы снарад на 38,04 метра. Напярэдадні Гульняў генеральны сакратар Нацыянальнага параалімпійскага камітэта Мікалай Шудзейка адзначаў, што галоўнае для Лізаветы — справіцца з нервамі і хваляваннямі. Як відаць, дзяўчыне гэта ўдалося. Тым больш яна сама расказвала, што ляцела ў Токіа па медаль. Цяпер Лізавета настроеная яшчэ больш сур'ёзную барацьбу са сваімі саперніцамі. На шляху да Токіа лёгкаатлетка паказвала дастойныя вынікі. На ўнутраных спаборніцтвах сярод здаровых спартсменаў устанавіла асабісты рэкорд — 38,04 метра. А на міжнародных стартах яе найлепшы вынік — 36,11 метра.

Ведаючы, хто яе трэнер, здаецца, іншага шляху як паказваць пастаянны прагрэс, у Лізаветы няма. Яна — вучаніца легенды параалімпійскай лёгкай атлетыкі Ігара Фартунова. Больш чым за 30 гадоў выступленняў ён сабраў дзевяць параалімпійскіх медалёў — адзін залаты, тры сярэбраныя і адзін бронзавы, дзевяць разоў станавіўся чэмпіёнам свету. Цяпер сваім багатым вопытам дзеліцца са спартсменамі ў Маладзечне. «Бронза» Лізаветы Пятрэнкі — паказчык таго, наколькі паспяхова ў яго гэта атрымліваецца.

### АДВАРОТНЫ БОК СПОРТУ

Свае карэктывы ў выступленне беларускай параалімпійскай каманды ўнёс і галоўны боль усяго свету — пандэмія каранавіруса. На жаль, ён не абмінуў і беларусаў. Перад самым стартам здалі тэсты і атрымалі станоўчы вынік плыўцы Максім Вашкевіч (клас S12 — праблемы са зрокам сярэдняй ступені цяжкасці) і Рыгор Зудзілаў (клас S11 — татальная слепата). Максіму Вашкевічу пашанцавала больш, ён «адсядзеў» дзесяцідзённы каранцін і паспеў выступіць на ста метрах, дзе заняў сёмае месца. А Рыгор Зудзілаў так і не выйшаў на старт.

За крок ад п'едэстала на спаборніцтвах у Токіа спыніліся тытулаваныя беларускія параалімпійцы. Алеся Макрыцкая ў фехтаванні на інвалідных калясках з рапірай пацярпела паражэнне ў 1/4 фіналу. Яе калега Андрэй Праневіч у спаборніцтвах на шпагах застаўся на чацвёртым радку выніковага пратакола. У плаванні Наталля Шавель на дыстанцыі 200 метраў комплексным стылем заняла пятае месца. Людміла Воўчак у паравеславанні ў лодцы-адзіночцы ў фінале Б заняла трэцяе месца, у канчатковым выніковым пратаколе яна размясцілася на дзявятай пазіцыі. У скачках у даўжыню ў класе T12 (парушэнні зроку) выступалі легендарныя беларускія лёгкаатлеты Ганна Канюк і Сяргей Бурдукоў, у фінале спаборніцтваў яны размясціліся на шостых месцах.

Звычайна, падводзячы вынікі галоўных стартаў, кажуць, што ўдзел у Гульнях — ужо вялікі поспех. У алімпійскіх сталіцах збіраюцца найлепшыя спартсмены з усяго свету. Часцей за ўсё гэта ўспрымаецца як суцяшэнне і прыгожыя словы. Кожны спартсмен марыць толькі аб перамогах ці хоць бы пра прызавыя месцы. Але ўсе ўдзельнікі Параалімпіяд ужо атрымалі галоўную перамогу — над самім лёсам і ўсімі яго выпрабаваннямі.

«Па меры таго, як мы будуем лепшы свет, 15 працэнтаў насельніцтва свету не могуць заставацца без увагі. Мы павінны глядзець не толькі на спартсменаў, якія так добра выступілі тут, але і на 1,2 мільярда людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Яны могуць і жадаюць быць актыўнымі грамадзянамі ў інклюзіўным свеце», — падкрэсліў прэзідэнт Міжнароднага параалімпійскага камітэта Эндру Парсанс падчас урачыстай цырымоніі закрыцця Гульняў у Токіа.

Лепш і не скажаш...

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## Проводятся открытые торги в форме аукциона по продаже имущества ООО «ОКНОГРАД», находящегося в процедуре ликвидации

| Наименование | Продажная стоимость, без НДС, бел. руб. |
|---|---|
| Метал. рольганговый стеллаж для тр. к. стеклопакетов | 7 782,88 |
| Монтажный стол б/у Lisec модель УК 140 год 2000 | 2 335,13 |
| Пила STB модель SD 15E-FM | 2 240,64 |
| Присоска для загрузки стекла на стол Pannkoke | 6 310,38 |
| Рама для разгрузки стекла Pannkoke | 1 875,33 |
| Ручной станок для производства стеклопакетов BUXTR | 15 337,38 |
| Стеллаж для хранения стекла Hegla | 997,41 |
| Стеллаж для хранения стекла Hegla | 997,41 |
| Стол для порезки стекла Boltero BCS 352 LMT/J | 19 382,39 |
| Установка компрессорная СБ4/С100, LB51 | 991,98 |
| Установка компрессорная СБ4/Ф500, TC2095 | 4 692,38 |
| Углошлифмашина одноручная GWS 850 CE 850Вт 125 мм | 135,94 |
| Пирамида | 740,11 |
| Пирамида 3,5x1,7x1,8 | 463,12 |
| Пирамида 3,5x1,7x1,9 | 463,12 |
| Пирамида № 2 | 937,40 |
| Автомат. Одноголовый сварочный станок OMRM 102A | 5 031,05 |
| Двухголовочная пила HAFFNER модель DGS 187 | 1 0326,34 |
| Зачистной станок STB модель WP-OF 1/F | 791,94 |
| Зачистной станок STB модель WP-OF 1/F | 1 124,24 |
| Копировально-фрезерный станок для фрез. Вод. OMRM 108 | 2 782,04 |
| Копировально-фрезерный станок STB модель F-101 | 576,16 |
| Копировально-фрезерный станок STB модель F-130 | 710,25 |
| Пила STB модель SD15E-F | 1 278,46 |
| Пила для резки штапика STB модель GS 225 M | 1 548,21 |
| Полуавтоматический трехфрезерный станок для фрезерования отверстий | 4 171,62 |
| Ручной станок для обработки торца импоста OMRM111 | 1 016,38 |
| Склад для фурнитуры URBAN | 3 152,03 |
| Стенд остекления URBAN | 2 034,32 |
| Стол монтажа фкрнитуры RYKO модель MST 2424P | 1 580,03 |
| Стружкоотсос мод. MF9025 | 545,76 |
| Углозачистной станок URBAN для обработки ПВХ профилей | 1 526,58 |
| Углозачистной станок URBAN | 4 287,55 |
| Углошлифмашина одноручная GWS 850CE/850B, 125 мм | 122,35 |
| Шуруповерт GEVO | 3 335,11 |
| Четырехголовый сварочный станок ACTUAL A4 V4030 | 18 375,1 |
| Двухголовая ПВХ сварочная машина WEGOMA | 3 566,16 |
| Импостовый станок STB модель F-125 | 866,11 |
| Механический копировально-фрезерный станок для фрез. Отв. | 3 875,62 |
| Пила для резки металла MACC, модель TRS 250 | 1 150,97 |
| Торцовочная пила Bosh HCM 8 S | 413,03 |
| Штабелер ручной/арт. PA1516/код22716 | 1441 |
| Штабелер ручной/арт. PA1516/код22717 | 1441 |
| Компрессор FINI модель E.C.BK119-100-5.5TP40050EU | 595,39 |
| Компрессор ATLAS COPCO модель GX11FF | 1 617,61 |
| Ресивер PB500.11.00 с арматурой | 534,73 |
| Ресивер PB500.11.00 с арматурой | 500,03 |
| Отопительный котел МИР-95 в комплекте | 2 843,80 |
| Установка компрессорная СБ4/СМ-100LB50 | 910,74 |
| Установка компрессорная СБ4/Ф-270.LB52 | 1 332,97 |
| Стол монтажа фурнитуры URBAN | 3 420,92 |
| Автомат. Станок для резки штапика (4ht; l) СЛН-501 | 1 686,79 |
| Ленточнопильный станок VG6200 | 4 773,38 |
| Индустриальный пылесос S38 L100FM4010500041 | 2 662,89 |
| Кондиционер Ballu BSG-12HG N1 | 2 027,36 |
| Автомобиль Peugeot 3008 кузов VF30U5FEABS310073, 2011 года выпуска | 18 000,00 |
| Автомобиль Peugeot 508 кузов VF30D5FEACL032390, 2012 года выпуска | 19 000,00 |
| Автомобиль Peugeot 508 кузов VF30D5FEACL036848, 2012 года выпуска | 16 000,00 |
| Автомобиль Мерседенс-Бенц 410D, 1990 года выпуска | 2000,00 |

Аукцион будет проводиться **11.10.2021 г. в 12.00** по адресу: 222310, Республика Беларусь. Минская обл., г. Молодечно ул. Рабочая, дом 1, офис 8 (место нахождения имущества).

Организатор аукциона Ликвидационная комиссия ООО «ОКНОГРАД».

Дополнительную информацию об условиях аукциона можно получить по телефону: +375293478964, по электронной почте: **siabrov@mail.ru.**

Срок подачи заявлений на участие – по 08.10.2021 г.

Реквизиты для перечисления задатка (5 % от стоимости имущества): Общество с ограниченной ответственностью «ОКНОГРАД»

***IBAN: BY34OLMP30121000432070000933***
***ОАО «Белгазпромбанк» ЦБУ № 501***
***г. Молодечно, ул. В. Гостинец, д. 143 Б***
***BIC-ISO: OLMPBY2X***

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 30 сентября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212 |
| Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17 |
| Начальная цена – 874 560,60 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 87 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **30 сентября 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 13.09.2021 по 28.09.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Веста-Борисов» (арендодатель) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ КУЛИНАРИИ № 4,

**инв. № 610/С-1769 общей площадью 130 кв. м, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 640400000011000317 площадью 0,2638 га (*право постоянного пользования*), по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 52, для организации торговли непродовольственной группой товаров, с возможностью, при необходимости использовать части помещения под склад, организации объекта общественного питания.**

**Размер ежемесячной арендной платы 97,5 базовой арендной величины. Условие – уборка прилегающей территории.**

Начальная цена права заключения договора аренды – **549,25** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**54,93** бел. руб.).

**Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта, перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Базовая арендная величина с 01.04.2020 составляет 17,85 бел. руб. В настоящее время базовая арендная величина составляет 16,90 бел. руб., т. к. введен мораторий на увеличение базовой арендной величины по 31 марта 2022 года. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **28.09.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.09.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,**
**сайт в сети интернет: www.rlt.by.**

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.01.2021.

УНН 600012029

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению КТПУП «Универмаг «Слуцк» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ (НАИМЕНОВАНИЕ – НЕЖИЛОЕ ПОМЕЩЕНИЕ)

**общей площадью 70,9 кв. м, с инв. № 640/D-70035, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, 142-61.**

Начальная цена без НДС – **66 400,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 6 640,00** бел. руб.).

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер 642500000001000431, площадь 0,1595 га, общее долевое право постоянного пользования.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки Случь, пл. 0,1595 га.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

**Условия:**

1. В случае отсутствия необходимости изготовления проектной документации в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество проинформировать Слуцкий районный исполнительный комитет (далее – райисполком) об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;

2. В случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектной документации:

обратиться в райисполком для получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ не позднее одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество;

начать разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ в течение 6 (шести) месяцев с даты получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;

согласовать с комитетом по архитектуре и строительству Минского областного исполнительного комитета предварительный проект на реконструкцию недвижимого имущества либо строительство нового с обязанностью его реализации.

3.Заключить договор купли-продажи недвижимого имущества на условиях, определенных райисполкомом.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Зязда» от 06.08.2021.

Аукцион состоится **27.09.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.09.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801795) 55-3-98; (8029) 348-93-25.**

УНП 600154568

## ОАО «ПИНСКИЙ ВИНОДЕЛЬЧЕСКИЙ ЗАВОД»

**сообщает о проведении 18.10.2021 г. первых электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:**

**1) Капитальное строение с инв. номером 240/С-45289,** расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, Межевский с/с, аг. Межево, ул. Центральная, 62, площадью 640,9 кв. м – 115 000,00 бел. руб. без НДС.

**2) Капитальное строение с инв. номером 333/С-21661,** расположенное по адресу: Гомельская область, Калинковичский район, г. Калинковичи, ул. Подольская, 18А площадью 478,7 кв. м – 165 000,00 бел. руб. без НДС.

**3) Мешки б/у из под сахара** стоимостью за одну единицу 0,25 рублей без учета НДС.

**4) Ящик п/э (лом)** стоимостью за один килограмм 0,80 рублей без учета НДС.

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by.**

УНН 200110728

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО«Веста-Борисов» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДА «СТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

*(составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое сборно-разборное здание павильона)*

**с инв. № 610/С-31189 общей площадью 183 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620850100014000761 площадью 0,0452 га (право аренды по 23.02.2039), по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Демина, 8Б.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 11 040,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 1 104,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **12.10.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.10.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (0177) 74 44 65, 8(029) 680 16 43.**

УНН 600012029

В **суд Лидского района Гродненской области** поступило заявление об объявлении умершим ЯЛОШЕВСКОГО Юрия Францевича, 19 ноября 1965 года рождения, уроженца и жителя г. Березовка, ул. Летняя, д. 14, Лидского района, Гродненской области.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, которым что-либо известно о Ялошевском Юрии Францевиче сообщить в суд Лидского района в течение двух месяцев с момента опубликования объявления по тел.: 646611, 646608.

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим БУСЬКО Елены Александровны, 18 апреля 1978 года рождения, проживавшей по последнему известному адресу: Гомельская область, Речицкий район, д. Озерщина, ул. Б. Дубро, д. 7.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение двух месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Бусько Елене Александровне.




## УРОК ДЛЯ БАБУЛІ

Неяк гарачым летнім днём я хацеў купіць бутэльку вады, заскочыў у невялічкую крамку і ўзрадаваўся: чаргі там не было — прадавачка, хлапчук гадкоў дзесяці і ўсё. «Значыць, не затрымаюся», — падумаў я і, на жаль, памыліўся, бо той юнец выцягнуў з кішэні ў чатыры столкі складзены спіс і па складах стаў чытаць:

— Са... Са... Сасіскі! Кра... Кра...

— «Кракаўскія»? — дапамагла яму прадавачка.

— Так. Але тут напісана і «ма... ма... малочныя», — лыпаў вачыма разгублены пакупнік.

— Дай мне свой спіс, — не вытрымала жанчына.

— Сасіскі «Кракаўскія» або «Малочныя», — зачытала ўслых. — Якія даваць?

— Ага, — забіраючы свой спіс назад, прамовіў хлопчык. — Я бабуліна «або» прапусціў, а яно тут важнае. Давайце «Кракаўскія»...

Прадавачка ўзялася іх узважваць ды пакаваць, пакупнік тым часам агучваў свой спіс далей:

— Ма... Ма... Два...

— Малако? Два пакеты? — зноў пайшла на выручку прадавачка.

— Можа, марозіва? — здагадаўся я.

— Гэта — абавязкова, — згадзіўся са мной юны пакупнік, але тут нешта іншае, карацейшае — на літару «мэ».

— Дык масла ж! — прачытала жанчына, зноў забраўшы цыдулку.

...З горам папалам і хвілін за дзесяць-пятнаццаць яны ўдваіх прайшліся па ўсіх пунктах спіса і нарэшце затармазілі на марозіве, бо менавіта з ім узнікла праблема: таго самага таннага, прапісанага бабуляй, у крамцы чамусьці не было.

— Давайце шакаладнае! — загадаў хлапчук.

— А не задорага будзе? — папраабаваў умяшацца я.

— Задорага, — згадзіўся малы. — Бабулі не спадабаецца. Але ж хай ведае і хай іншым разам лепей піша, што ёй трэба купіць, друкаванымі літарамі, а то накрэмзала тут... Дарослым не прачытаць.

З гэтымі словамі малы паклаў да пакупак спіс і чэк (трэба разумець, для справаздачы?) і хуткім крокам рушыў да дзвярэй — не тое каб парадаваць бабулю (выканаў жа яе заданне!), не тое каб з'есці тое марозіва.

...Што казаць, многаму мы вучым сваіх дзяцей (а каму пашчасціць, яшчэ і ўнукаў!), многаму яны вучаць нас.

**Яўген Шастакоў,**

*г. Гомель.*

## РЭДКІ ГАСЦІНЕЦ

У дзіцячым садку, у які мы вадзілі нашага ўнука Вову, на памяць і бацькам і дзецям вырашылі зрабіць відэафільм. Для гэтага запрасілі апаратара з адмысловай камерай і запісалі шэраг «інтэрв'ю»: выхавальніца на чарзе распытвала ў малых, дзе і з кім хто жыве, як завуць бацькоў, кім яны працуюць...

— У цябе ёсць дзед? — апроч іншага, спыталі, напрыклад, у нашага Вовы.

— Ёсць, — адказаў той.

— А як яго завуць?

— Іван.

— Бабуля таксама ёсць? — удакладніла выхавальніца.

— Ёсць...

— Яны часта да вас прыходзяць?

— Прыходзяць...

— А што прыносяць?

— Хрэн...

Мы і сапраўды (справа жыццёвая, як казаў знаходлівы Карлсан) якраз напярэдадні занеслі дачцэ слоік з гэтай прыправай, але ж...

І падчас запісу таго «інтэрв'ю», і падчас «прэм'еры» фільма, і потым, падчас кожнага прагляду, гледачы заходзяцца ад рогату.

А ў мяне за вочы яшчэ, відаць, і мянушка «Дзед з хрэнам».

**Іван П.,**

*г. Шчучын.*

## ВУЧЫСЯ, НЯБОЖА, ВУЧЭННЕ ПАМОЖА...

Не ведаю, як іншыя, а вось пажарнікі любяць сваю работу хваліць. Маўляў, і зарплата ў іх што трэба, і калектыў, і графік зручны... Адзінае — як пажар, дык хоць ты звальняйся!

Студэнты прыкладна гэтак жа ставяцца да экзаменаў, бо яно і зразумела: нешта ведаюць лепш, нешта — горш, а недзе і наогул плаваюць, як тая сякера. Адкуль заўсёдная мара — на экзамене, на заліку выцягнуць лёгкі білет альбо нечым спадабацца выкладчыку.

Не апошнюю ролю тут можа сыграць знешнасць: прычоска, адзенне, макіяж.

...У нас, напрыклад, псіхалогію выкладаў малады мужчына, які вельмі сачыў за сабой. Таму на экзамен па яго прадмеце мы, дзяўчаты (хлопцам куды прасцей), рыхтаваліся загадзя: рабілі прычоскі і манікюры, прыбіраліся ў адмысловыя абляганочыя сукенкі-дэкальтэ, фарбавалі вусны і вейкі...

Паднядзеліўся вось так да адказу, сядзеш перад выкладчыкам, а той ужо ўсё заўважыў і ацаніў — падрыхтаваўся ўважліва слухаць, падбадзёрыў усмешкай... І ўсё: Астапа панесла, як той казаў: залік амаль што ў кішэні!

Наступны экзамен па заалогіі. Прымае яго, мякка кажучы, вельмі пажылы выкладчык. І таму ніякіх прычосак-макіяжаў: валасы заплятаюцца ў косы ці закручваюцца ў гулі, пазногці акуратненька стрыгуцца, сукенкі выбіраюцца, а то і пазычаюцца, калі сваёй няма) строгія, адnatoнныя, пажадана — з белымі каўнярамі...

Такая вось «сама сціпласць» прыйдзе на экзамен, сядзе перад выкладчыкам і як залапоча... Вядома ж, пра тое, што добра ведае... Што горш — там ужо цішэй. А выкладчык — той і слепаваты ўжо, і глухаваты — не перапытвае, не перабівае. Ён слухае, любуецца, бярэ залікоўку...

У студэнткі ў гэты час шпаргалка з рукава... І на падлогу. Але ж яе можна хуценька падняць, сказаць, хаваючы ў сумачку: «Ой, гэта ж рэцэпт... Мой... Бабуля прасіла ў аптэку зайсці, а я так хвалявалася перад вашым экзаменам, так старанна вучыла...» І ўсё: «выдатна» вам забяспечана!

Праз два дні экзамен па анатоміі. Прымае дзеўка-векавуха, якая ведае ўсё і таго ж патрабуе ад іншых. Так што «нумар» з рэцэптам з ёй не пройдзе ніяк. І за адзеннем яна бачыць хіба шкілет. Значыць, застаецца адно: вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца.

...Іншымі словамі, прынцыпы здачы экзаменаў («тушэння пажараў») вам зразумелы: грызці граніт навукі і шукаць падыход да выкладчыка, а «па дарозе» пастарацца не ўпасці ў бруд самому.

Як некалі пісаў паэт, «Мы все учились понемногу...»

Той, у каго студэнцкія гады ўжо за плячыма, прачытаўшы гэтую нататку, можа, успомніць сябе, той, хто толькі паступіў, можа, узброіцца нейкімі ведамі. Яны — паверце — ніколі не лішнія!

**Зоя Максімава,**

*г. Віцебск.*

## «БЫЛО З ЧАГО І ПЛАКАЦЬ, І СМЯЯЦЦА...»

«Звязда» досыць часта піша пра наша Палессе, і яно, вядома ж, таго заслугоўвае: блаславёны край, цудоўныя людзі!

Да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС мне пашчасціла жыць і працаваць у Хойніцкім раёне, на радзіме Івана Мележа. Што здзіўляла, бязбожныя былі часы, але там неяк трымалася традыцыя адзначаць рэлігійныя праваслаўныя святы, прычым у кожнай вёсцы свае...

Ажаніўшыся з паляшучкай і на першым часе пасяліўшыся ў цешчы, я даведаўся, што да наплыву гасцей там рыхтуюцца загадзя.

Помню і тое, як яны з'язджаліся. Да сёння ў вушах паважнае мужчынскае: «Ну, здароў быў, сват!» ды эмацыянальнае, часта жаночае: «Ой жа, кума мая! Колькі ж я цябе не бачыла?!»

Пасля вітанняў радня садзілася за стол, знаёмілася са мной (а я тым часам — з ёю) — частавалася, гаманіла, потым нехта спяшаўся дамоў, каб дагледзець скаціну, нехта гасціў сабе далей. Мужчыны выходзілі на двор пакурыць, жанчыны заставаліся ў зале. І я, разам з жонкай наводзячы парадак на сталах, міжволі слухаў...

— Ой, бабачкі, гэты Алесь Валяваты ну такі ліхач! — расказвала неяк цётка Клаўдзя з суседняй вёскі. — Я з ім ніколі больш не паеду!.. Той раз во — толькі ў кузаў, а ён як папрэ... Я адной рукою за яйцы, а другой — за тэ...

— Гэта за што? — рагочуць жанчыны.

— Ну як яго? Ну за борт, — успамінае нарэшце Клаўдзя.

Слухачкі аж заходзяцца ад рогату, паўтараюць Клаўдзіна «другой рукою за тэ...» ды канцамі хустак выціраюць слёзы.

Клаўдзя лыпае вачыма і нічога не разумее: ну сабрала яна кошык курыных яек, ну склала ў кош... Ну падвёз яе той Алесь на сваёй грузавой — у кузаве, бо ў кабіне месца не было. Ну пёр як на пажар...

— Добра, што яйкі я сенам перакладала... Цэлымі давезла, — завяршала расповед свой Клаўдзя, і толькі тут, зразумеўшы яго двухсэнсоўнасць, сама ж расплывалася ў беласубай усмешцы...

А потым, нарагатаўшыся, жанкі адпачывалі і заводзілі ўжо сумнае: «Шумяць вербы каля грэблі, што я пасадзіла...»

Мележ, казалі, вельмі любіў гэту песню, і, калі прыязджаў, на сустрэчу заўсёды запрашалі самадзейных артыстаў з Глінішчанскага сельскага клуба.

Хор спяваў, народны пісьменнік са слязамі на вачах слухаў, а «сведкі» потым адзін аднаму казалі: «Глядзіце, Іван наш плача».

Было з чаго...

**Валерый Гаўрыш,**

*г. Чавусы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж.** Шчыры дзякуй усім, хто заўважыў «знікненне» «праводу», хто абурыўся ды спытаў, ці не парваўся ён?

Хачу суцешыць: пакуль што не, але...

Усё залежыць ад вас. Пішыце. Конкурс на найлепшую, вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца.

Неасабісты суб'ектыў



# НА ЎСЕ ВЫПАДКІ ЖЫЦЦЯ

## Дзе сёння найменш залежыш ад абставін

Грыбы сёлета валаклі з лесу, як дурань дзверы: літаральна згінаючыся пад цяжарам рукзакоў ды пакетаў. Балазе ісці было зусім блізка: зазірнулі ў невялікі лес, што ад вёскі мо за паўкіламетра. А там апенек! Прыгожыя, беленькія, крамяныя. Адны — на таўсматых ножках з невялікімі капялюшыкамі, іншыя — бы пляскатыя рудавата-белыя аладкі, што хаатычным стосам абляпілі пень. Рэжаш адны — ужо краем вока заўважаеш другія. Дайшло да таго, што ў канцы ціхага палявання стаялі з сястрой каля чарговага пня і спрачаліся не за права зрэзаць гэтае багацце, а за тое, каб адпачыць і паназіраць, пакуль іншая тыя грыбы збярэ (бо не пакідаць жа іх у лесе!). Дома перабралі — у чыстым выніку атрымалася два вялікія вядры з коптарам. Карацей, даўно так удала ў грыбы не хадзілі.

Замачылі апенькі на ноч у вялікіх ночвах, плануючы зварыць іх назаўтра на вуліцы — на вогнішчы, як рабілася спрадвеку. Сёлета нашы хлопцы нават нешта падобнае на печку з цэглы ў садзе склалі. Але прачнуўшыся раніцай ад грукату залевы па даху і ўбачыўшы, што неба спрэс зацягнутае хмарамі, зразумелі, што нічога з садова-палявой кухняй у нас не атрымаецца. Пачалі думаць, у чым і як тыя грыбы варыць. На газавую пліту два вялікія чыгуны ставіць — не змесціцца, дый пакуль такая колькасць варыва гатовая будзе, увесь газ з балона выпалім. Ставіць гаршкі ў печ таксама не выпадала: грыбы, калі закіпаюць, пачынаюць, ліха на іх, перці, іх трэба абавязкова памешваць. А дзеля гэтага, атрымліваецца, у гарачую печ давядзецца лезці з галавой, на што хіба вар'ят пагодзіцца...

Так і стаялі мы над тымі ночвамі з апенькамі, чухаючы патыліцы і разважаючы, што многа — гэта не заўсёды добра. І тут раптам узнікла ідэя — пліта! Не газавая, а тая, што ў печы наперадзе, з дзвюма адмысловымі «фаеркамі» на прыпеку, якія можна падганяць пад дыяметр посуду, дзе гатуеш, дастаючы металічныя кольцы. Нехта з вяскоўцаў зараз скажа: вось Амерыку адкрыла, падобныя пліты ў многіх хатах дагэтуль ва ўжытку, каб і есці згатаваць, і кухню абагрэць, печ не палячы... Але справа ў тым, што сваю мы палілі апошні раз — добра памятаю — калі я была ў шостым класе. Тады памёр сусед, і ў нашай хаце гатавалі ўсё на жалобны стол. А з таго часу мінула ўжо... Карацей, не адзін дзясятак гадоў...

Надзеі на тое, што даўно закінуты «агрэгат» запрацуе як належыць, было мала, але ж трэба было неяк варыць тыя няшчасныя грыбы! Галоўная рызыка была — задыміць усю хату, бо адмысловы дымаход мог за доўгія гады забіцца чым заўгодна. З цяжкасцю выцягнуўшы юшку, з якой на падлогу зваліліся мо паўкіла сажы, ачысціўшы ад смецця печку і паддувала, у якіх хіба што сушаных дохлых мышэй не было, і паклаўшы дровы, я асцярожна паднесла да бяросты запалку і стала чакаць, як вось-вось дым паверне на хату, і думаць, як усё гэта найхутчэй патушыць. Нічога падобнага! Агеньчык, спачатку кволенькі, ад добрай цягі хутка набраў сілу. А над комінам закруціўся вясёлы дымок. Працуе!

Паставіўшы на пліту два вялікія гаршчкі, у якія з лёгкасцю змясціўся ўвесь наш грыбны ўраджай, раз-пораз без ніякіх перашкод іх памешваючы, мы цешыліся сваёй прыдумкай. Падкідалі ў пліту дробна наколатыя дроўцы, успаміналі бабуліны бліны, якія яна пякла менавіта на ёй, бо з «газам» да канца жыцця так і не пасябравала. З далёкага-далёкага дзяцінства, наздраватыя, з цёмнымі кропачкамі, з лёгкім водарам жару ад бярозавых дроў — самыя смачныя бліны, што даводзілася каштаваць у жыцці. А яшчэ гаварылі аб простых сялянскіх рэчах, аб тым, як па-разумнаму было ўсё зладжана ў вясковай хаце, каб у любым выпадку выжыць і не прапасці. Нават сёння, у век цывілізацыі, ад здабыткаў якой мы вельмі залежныя, прычым у самым прамым, фізічным сэнсе.

Бо адна справа — застацца на нейкі час без інтэрнэту. І зусім іншая — без электрычнасці, напрыклад, у шматпавярховым доме, дзе нават есці варыш з яе дапамогай. Ведаю гэта на ўласным вопыце. Калі толькі засяліліся, пэўны час былі непаладкі з напружаннем. У хаце цёмна, нічога не прыгатуеш, нават вады не сагрэеш, батарэі і вада ў кране пачынаюць астываць — бо і яны ад нейкай там электрычнай помпы залежаць. Карацей, лакальны апакаліпсіс. Дык гэта калі на нейкія дзве гадзіны. А калі на больш?..

Дзіўна можа прагучаць, але атрымліваецца, што найбольш незалежным ад абставін і таго, што адбываецца навокал, адчуваеш сябе менавіта ў вёсцы, прычым у самай спрадвечнай, патрыярхальнай. Там, дзе ў хаце захавалася сапраўдная печ, дзе ў калодзежы вісіць на вочапе вядро (хоць каторы год набіраеш ваду з дамамога электрычнай помпы), дзе стаіць на загнетку прас, які награвaецца вугельчыкамі, што ў яго засыпаюцца. Гэтым рыштункам дакладна ніхто з нас нават не спрабаваў карыстацца, але ён так і стаіць на сваім месцы, як і гадоў пяцьдзясят таму, і мы нават не думаем пра тое, каб яго выкінуць з-за непатрэбнасці. Гэткі запасны варыянт на неспадзяванку, якая, можа, і не здарыцца ніколі ў жыцці, але ж няхай на ўсялякі выпадак будзе... Усё, як мы, беларусы, любім. Бо прызнайцеся, не ў адной жа мяне ў вясковай хаце стаіць на печы ржавы вугальны прас?.. Вось і я пра тое ж.

А як жа грыбы, спытаеце. Грыбы паспяхова даварыліся і перамясціліся ў слоікі або ў лядоўню. А на пліце, ужо не падкідаючы дроў, яшчэ нагрэлі амаль да кіпеню вялікую каструлю вады. Сама ж пліта нагрэлася лепш, чым сталічная батарэя, і тым сырым халодным вечарам у кухні і маім пакоі было на дзіва цёпла і ўтульна. І хораша было засынаць у гэтым утульным цяпле, ведаючы, што ты сам сабе яго зладзіў...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, ул. Слуцкое шоссе, 26**

**Здание магазина** (общ. пл. 268,9 кв. м, инв. № 600/С-171336, составные части и принадлежности: пристройка, сарай-пристройка, сарай).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1222** га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 25.01.2120) для строительства и обслуживания магазина. Ограничения (обременения) прав: природная территория, подлежащая спец. охране (в зоне санит. охраны источников питьевого водоснабжения централиз. систем питьев. водоснабжения (3-й пояс-262, 267-268)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 722 865, 60 бел. руб.**

**Лот № 2**
**Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Молодежная, 12**

**Административное здание** (общ. пл. 1079,3 кв. м, инв. № 630/С-54835).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1244** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания администрат. здания

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 1 095 000,00 бел. руб.**

**Лот № 3**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, г. п. Мачулищи, ул. Гвардейская, д. 5**

**Кафе-бар «Отдых»** (здание специализир. для общест. питания, общ. пл. 219,1 кв. м, инв. № 600/С-105461, составные части и принадлежности: пристройка).
**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0914** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания кафе-бара «Отдых»

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 474 000,00 бел. руб.**

**Лот № 4**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, пер. Калинина, д. 36**

**Столовая** (здание специализир. для общест. питания, общ. пл. 282,8 кв. м, инв. № 600/С-117001, составные части и принадлежности: три пристройки).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0659** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 469 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

